ЭТНАГЕНЕЗ БЕЛАРУСАЎ І ЭТНІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ **6**

ОПТИМИЗАЦИЯ ИЗДЕРЖЕК НА СИСТЕМУ НТИ **36**

ПОДДЕРЖКА ЦИФРОВИЗАЦИИ МАЛОГО И СРЕДНЕГО ПРЕДПРИНИМАТЕЛЬСТВА **52**

ДОРОГА К ТВОРЧЕСКОМУ УСПЕХУ **56**

# Наука и инновации

№2 (216)
ФЕВРАЛЬ 2021

научно-практический журнал



## ПРАДМЕТНАЕ ПОЛЕ ЭТНАЛОГІІ

ISSN 1818-9857

ISSN 2412-9372 (online)

# ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАЛОГІІ

**Анатацыя.** *Адзначаны найважнейшыя праблемы сучаснай беларускай этналагічнай навукі, якія знайшлі ўвасабленне ў даследаваннях супрацоўнікаў аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.*

**Ключавыя словы:** *беларуская этналагічная навука, даследаванні супрацоўнікаў аддзела народазнаўства*



**Аляксандра Гурко (Верашчагіна),**
заг. аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,
доктар гістарычных навук

Сярод найважнейшых праблем сучаснай беларускай этналагічнай навукі, якія знайшлі ўвасабленне ў працах супрацоўнікаў аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, адзначым заканамернасці фарміравання і этнічнага развіцця беларускага народа, узаемадзеяння яго культуры з іншымі народамі, эвалюцыі традыцыйнай айчыннай матэрыяльнай, сацыяльнай і духоўнай культуры, механізмы яе адаптацыі да змен ва ўмовах урбанізацыі і глабалізацыі, заканамернасці і шляхі яе фарміравання, даследаванне дыяспар. Значнае месца займае вывучэнне этнічнага вопыту беларусаў, які з'яўляецца важным фактарам развіцця сучаснай культуры.

Комплекснае даследаванне асноўных напрамкаў культуры этнічных груп Рэспублікі Беларусь актуальна для ўліку каштоўных элементаў этнічных традыцый у нацыянальным кантэксце: забеспячэнні правоў этнічных супольнасцяў краіны, ранняга папярэджання ўзнікнення канфліктаў на гэтай глебе, умацавання нацыянальнай бяспекі, вырашэння праблемы фарміравання агульнаграмадзянскай беларускай ідэнтычнасці. На сучасным этапе развіцця поліэтнічнага беларускага грамадства этнічныя супольнасці прымаюць актыўны ўдзел у стварэнні агульнай этнакультурнай прасторы і складванні нацыянальнай ідэнтычнасці краіны.










Усе гэтыя тэмы знайшлі ўвасабленне ў тэматыцы дзяржаўных заданняў, якія рэалізуюцца супрацоўнікамі аддзела народазнаўства. Так, у 2016–2020 гг. (падпраграма «Гісторыя і культура») выконвалася НДР «Сучасныя этнічныя традыцыі Рэспублікі Беларусь»; у 2011–2015 гг. распрацоўвалася тэма «Этнакультурнае развіццё Рэспублікі Беларусь»; у 2006–2010 гг. – «Традыцыі народнай культуры этнічных супольнасцяў Беларусі: гісторыя, сучасны стан і перспектывы развіцця». Вынікамі гэтых навуковых пошукаў стала падрыхтоўка раздзелаў для шматтомнага навуковага выдання «Этнакультурныя працэсы ў гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі» (выйшла 5 тамоў, апошні з якіх прысвечаны Заходняму Палессю). У 2018 г. распачата навукова-папулярная серыя «Свет вачыма этнолага», дзе ўжо выдадзены чатыры кнігі аб сучасных этнічных і этнаканфесійных супольнасцях Беларусі, асаблівасцях матэрыяльнай культуры насельніцтва краіны. Рыхтуюцца кнігі, прысвечаныя культуры беларускай дыяспары.

У нашых даследаваннях і мерапрыемствах знайшлі месца таксама значныя падзеі ў навуковым жыцці і юбілейныя даты вядомых навукоўцаў. У сакавіку 2020 г. у Магілёве прайшла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Жизнь и творческое наследие А.С. Дэмбавецкага (к 180-летию со дня рождения)». У Слуцку 8 кастрычніка 2020 г. – Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя з нагоды 100-годдзя са дня нараджэння знакамітага беларускага этнолага, заснавальніка школы беларускай этналогіі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі В.К. Бандарчыка (1920–2009).

Аддзел народазнаўства – гэта высокакваліфікаваны калектыў супрацоўнікаў, якія маюць значны вопыт у даследаванні этнакультурных, міжэтнічных і міжканфесійных адносін і стасункаў, у яго складзе член-карэспандэнт НАН Беларусі, 7 дактароў навук, 5 кандыдатаў гістарычных навук, 7 навуковых супрацоўнікаў. Гэта сведчыць аб высокім патэнцыяле беларускай этналагічнай школы і вызначае перспектыўнасць яе далейшага развіцця.





# ЭТНАГЕНЕЗ БЕЛАРУСАЎ і этнічная гісторыя нашай краіны



**Сяргей Шыдлоўскі,**
дактарант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Нягледзячы на драматычныя падзеі XX ст., у гісторыі вывучэння праблем этнагенезу беларусаў і этнічнай гісторыі нашай краіны адсутнічаюць істотныя разрывы пераемнасці – і постсавецкі перыяд даследаванняў таксама з'явіўся арганічным працягам папярэдніх этапаў развіцця айчыннай навукі. Знакавым у гэтай сувязі выглядае правядзенне ў 2020 г. Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння В.К. Бандарчыка, а таксама выхад з друку тома выбраных прац вучонага [1].

У перыяды стабільнага развіцця грамадства пераемнасць у навуковых даследаваннях забяспечваецца ў значнай ступені за кошт інерцыі сістэмы, у часы ж крызісу прынцыповае значэнне набывае фактар асобы. Васіль Кірылавіч Бандарчык і як навуковец, даследчык гісторыі беларускай этнаграфіі, і як арганізатар навукі, і як педагог выконваў ролю злучальнага звяна паміж сучаснасцю айчыннай этналогіі і яе папярэднімі этапамі развіцця. У 1985 г. пад яго рэдакцыяй падрыхтавана калектыўная манаграфія «Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя» [2]. З аднаго боку, кнігу можна лічыць падсумаваннем зробленага айчыннымі вучонымі ў дадзенай галіне за савецкі перыяд. Разам з тым, на яе старонках прагучалі новыя ідэі і тэмы, якія сфарміруюць цэнтральны кірунак даследаванняў ужо ў постсавецкі перыяд. Напрыклад, вялікая ўвага ў манаграфіі надавалася этнічным працэсам у ВКЛ і Рэчы Паспалітай, што з'яўлялася смелай навацыяй для савецкай гістарыяграфіі. Перыяд XIV–XVI стст. разглядаўся як час фарміравання беларускай народнасці і складання старажытнабеларускай мовы, больш збалансавана адзначалася

**Анатацыя.** *У артыкуле разглядаецца беларуская гістарыяграфія ў галіне этнагенезу беларусаў і этнічнай гісторыі Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. Выяўляюцца асноўныя тэндэнцыі ў практыках вывучэння этнакультурных працэсаў на беларускіх землях, ключавыя напрамкі і даследаванні ў этналогіі разглядаемага перыяду, прасочваецца пераемнасць падыходаў у працах аўтараў. Адзначаецца сувязь навуковай работы з запытамі грамадства, вызначаюцца перспектывы развіцця беларускай этналагічнай навукі.*

**Ключавыя словы:** *этнагенез беларусаў, этнічная гісторыя Беларусі, агляд гістарыяграфіі, беларуская этналогія.*



роля элітарных груп у этнакультурных працэсах. Шляхта характарызавалася як метаэтнапалітычная супольнасць Рэчы Паспалітай. Уводзіліся новыя крыніцы для этналагічнага аналізу, напрыклад звычаёвае права. Таксама істотна, што на старонках манаграфіі заявілі пра сябе маладыя вучоныя, якія ў наступныя дзесяцігоддзі вызначалі новыя даследчыцкія трэнды: І.У. Чаквін, П.У. Церашковіч, Г.І. Каспяровіч, І.Г. Вуглік.

У другой палове 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. на хвалі абуджэння цікавасці да беларускай нацыянальнай культуры ў цэнтры грамадскіх дыскусій апынуліся праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі. На фоне разбурэння камуністычнай ідэалогіі адраджалася не толькі нацыянальная свядомасць тытульнай нацыі, але і палітычная актыўнасць нацыянальных меншасцей, праяўляліся рэгіянальныя ідэнтычнасці. Форумам для маніфестацыі новых ідэй зрабілася газета творчай інтэлігенцыі Беларусі «Літаратура і мастацтва». Менавіта на старонках дадзенага выдання прагучалі тэзісы пісьменніка І.А. Ласкова, якія ляглі ў аснову яго «фінскай» канцэпцыі паходжання беларусаў. Папулярызавалася канцэпцыя «летапіснай Літвы» краязнаўцы М.І. Ермаловіча. Анансавалася арганізацыя заходнепалескага аўтанамісцкага руху.

Сярод самых вострых пытанняў гэтага часу была праблема фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, абмяркоўваліся феномены «тутэйшасці» і двухмоўя. Кампетэнтным водгукам на гэтае грамадскае запатрабаванне з'явіўся артыкул І.У. Чаквіна і П.У. Церашковіча «Из истории становления национального самосознания белорусов (XIV – начало XX в.)» [3].

Найбольш грунтоўным падсумаваннем гэтай дыскусіі можна лічыць манаграфію М.Ф. Піліпенкі «Возникновение Белоруссии: новая концепция» [4]. Кніга стала новым эталонам навуковага тэксту ў беларускай этналогіі. Яе вызначаюць збалансаванасць высноў і выверанасць логікі. М.Ф. Піліпенка абгрунтаваў «старажытнабеларускую» канцэпцыю этнагенезу, паводле якой непасрэднымі продкамі беларусаў з'яўляліся прадстаўнікі двух этнічных супольнасцяў – старажытных беларусаў і старажытных палешукоў, а таксама асобных груп польскага, балцкага і цюркскага насельніцтва.

Тэндэнцыі, якія ўпершыню шырока выявіліся ў грамадскай думцы 80-х гг. XX ст., набылі большую інтэнсіўнасць на працягу 90-х гг. XX ст. – 10-х гг. XXI ст. Яны выйшлі з поля грамадскіх дыскусій у плоскасць спроб фарміравання альтэрнатыўных ідэнтычнасцей («ліцьвіны», «крэвы»). Варта адзначыць агульную тэндэнцыю гэтага часу да пашырэння кола навуковых асяродкаў, прадстаўнікі якіх пачалі шырока цікавіцца пытаннямі этнагенезу

беларусаў – ад філосафаў (А.В. Дзермант, С.І. Санько) [5] да генетыкаў (А.Г. Давыдзенка, А.П. Баланоўскі). З акадэмічнага поля дадзеная праблема ў гэты перыяд актыўна пераводзілася ў плоскасць геапалітычнага і цывілізацыйнага выбару, што не заўжды ішло на карысць якасці навуковых дыскусій.

Між тым постсавецкая эпоха адкрыла перад айчыннай этналогіяй новыя далягляды магчымасцей. Зніклі ідэалагічныя абмежаванні, што спрыяла пашырэнню абсягаў даследчыцкага поля. Так, адбылася адмова ад трактоўкі беларусаў як «сялянскай нацыі» і ўзнікла патрэба запаўнення «белых плям» у навуковым вобразе грамадства, у прыватнасці пры вывучэнні генезісу прывілеяваных груп і іх ролі ў этнакультурных працэсах. Першыя крокі ў гэтым кірунку рабіліся яшчэ ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. І.У. Чаквіным, П.У. Церашковічам, Т.А. Навагродскім.

З 1995 г. пачала выходзіць серыя манаграфій «Беларусы» (1995), якая стваралася супрацоўнікамі ІМЭФ ім. К. Крапівы. У прыватнасці, варта адзначыць калектыўныя даследаванні «Вытокі і этнічнае развіццё» [6] (В.К. Бандарчык, В.М. Бялявіна, Г.І. Каспяровіч, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак, М.Ф. Піліпенка, І.У. Чаквін) і «Славянскія этнакультурныя традыцыі» [7] (А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак, І.У. Чаквін), якія непасрэдна былі прысвечаны разгляду праблем этнагенезу і этнічнай гісторыі.

Значнай для айчыннай этналогіі з'явай стаў выхад у 2004 г. манаграфіі П.У. Церашковіча «Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы» [8]. Аўтар абнавіў метадалагічны інструментарый беларускай этналогіі, паспрыяў уключэнню яе ў плынь сучасных ідэй і падыходаў. Для навуковага аналізу П.У. Церашковіч выбраў ключавы ў фарміраванні беларускага этнасу перыяд, які адначасова і найбольш складаны для вывучэння. Аўтару ўдалося выйсці за звыклыя схемы ўспрымання дадзенага перыяду. Гэтае даследаванне, хоць і выйшла ў 2004 г., дасюль захоўвае ў сабе высокі абнаўленчы патэнцыял.

З прыходам у 2004 г. на пасаду дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.І. Лакоткі больш паслядоўнай становіцца тэндэнцыя да пашырэння даследчыцкай тэматыкі ІМЭФ. Важнай вяхой на гэтым шляху быў выхад двухтомнай працы В.М. Бялявінай і Л.В. Ракавай «Беларускі касцюм» [9, 10], на старонках якой упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі разгорнута разглядалася гісторыя касцюма гарадскіх груп беларускага грамадства. Варта згадаць серыю публікацый С.А. Мілючэнкава, прысвечаных аналізу тыпаў надворных пабудоў магнацкіх і шляхецкіх маёнткаў. У 2004 г. адбылася абарона дысертацыі А.А. Кілбас «Культура привилегированного сословия в Беларуси (XIV–XVI вв.)» [11], у 2009 г. – С.А. Шыдлоўскага «Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя» [12]. Піянерны характар насілі работы В.Ф. Бацяева «Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е годы XX века. Этнологическое исследование» [13] (2016) і А.Р. Раюка «Этнасацыяльная структура беларускага грамадства і шляхі сацыяльнай мабільнасці ў 1772–1863 гадах» [14] (2008), на старонках якіх упершыню панарамна была паказана дынаміка развіцця сацыяльнай культуры розных груп беларускага грамадства. Гарадскія аспекты этнаграфіі распрацоўвае А.Р. Яшчанка [15], этнаканфесійныя працэсы на новым узроўні сучасных ведаў вывучаюць А.У. Гурко [16] і А.В. Гурко [17, 18]. Пералічаныя работы спрыялі накапленню значнага масіву фактаграфіі, уводзілі ў навуковы зварот новыя крыніцы, пашыралі вобласць даследавання айчыннай этналогіі, развівалі міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне, што аб'ектыўна стварала новыя перадумовы для паглыблення вывучэння этнічнай гісторыі Беларусі. Прэзентацыя першых вынікаў распрацоўкі новых кірункаў даследаванняў адбылася на старонках шматтомнай калектыўнай манаграфіі «Нарысы гісторыі культуры Беларусі».

У разглядаемы перыяд праводзілася плённае вывучэнне культуры нацыянальных меншасцей нашай краіны (У.Я. Аўсейчык, Н.С. Бункевіч, С.А. Захаркевіч, Ю.І. Унуковіч, А.Н. Рагімаў, С.Л. Сакума, У.В. Тугай, Т.І. Хурсан, В.В. Шэйбак і інш.). У 2017 г. выйшла калектыўная манаграфія «Беларусь. Этнічныя супольнасці» [19]. Вяртаўся ў айчынны навуковы зварот значны масіў польскамоўных этнаграфічных даследаванняў, дзякуючы актуалізацыі апошніх у публікацыях А.М. Ненадаўца, Т.А. Навагродскага, М.А. Міхальца, І.У. Алюнінай,

выданню спадчыны К. Машынскага і Ч. Пяткевіча. Адбывалася інтэнсіўнае засваенне напрацовак сучаснай замежнай этналагічнай думкі. Больш актыўнымі зрабіліся навуковыя кантакты з замежнымі вучонымі, у першую чаргу рускімі і польскімі. Творчасць некаторых з іх станавілася фактарам развіцця ўласнабеларускіх навуковых дыскусій (напрыклад, выступленні В. Бяловай, А. Латышонка, Р. Радзік і інш.). Пазітыўна і плённа наладжвалася ўзаемадзеянне з антрапалагамі, археолагамі, мовазнаўцамі.

Дэцэнтралізацыя навуковай дзейнасці ў постсавецкі перыяд, з'яўленне новых этналагічных даследчых цэнтраў, у тым ліку ў рэгіёнах, ідэалагічны плюралізм, – усё гэта стала новым пазітыўным імпульсам для развіцця айчыннай навукі, але ў пэўных выпадках прыводзіла да фрагментацыі навуковага поля. У гэтых умовах выданне серыі «Этнокультурные процессы историко-этнографических регионов Беларуси» (навуковы рэдактар А.В. Гурко) стала з'явай аб'ектыўна своечасовай [20–24].

Серыя актуалізуе і трымае ў фокусе ўвагі айчыннай навукі складаныя і прынцыповыя пытанні, у першую чаргу праблемы этнічнай гісторыі Беларусі. З'яўленне гэтай серыі падрыхтавана і абумоўлена ўсёй перадгісторыяй вывучэння этнакультурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі і шматгадовым вопытам навуковай работы такіх аўтараў, як В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.В. Гурко, А.У. Гурко, Г.І. Каспяровіч, Т.І. Кухаронак, Т.А. Навагродскі, В.С. Новак, Л.В. Ракава, І.У. Чаквін, В.М. Ярмалінская. Яна была б немагчыма без распрацоўкі ў айчыннай этналогіі самога пытання гісторыка-этнаграфічнага раяніравання Беларусі (В.С. Цітоў, А.І. Лакотка і інш.) [25, 26].

Серыя стала той пляцоўкай, дзе публікуюцца даследаванні вучоных з рэгіянальных навуковых асяродкаў. У межах дадзенага праекта побач з аўтарытэтнымі айчыннымі і замежнымі навукоўцамі атрымалі магчымасць выйсці да зацікаўленай чытацкай аўдыторыі маладыя аўтары. Кнігі серыі даюць уяўленне аб рабоце «сярэдняга пакалення» беларускай этналогіі – І.У. Алюнінай, Н.С. Бункевіч, С.В. Грунтова, І.В. Раманенкі, С.Л. Сакумы, В.В. Шэйбака і інш., а таксама «моладзі» – А.М. Ізергіной, А.А. Крумплеўскай, Ю.С. Пракоф'евай і інш. НИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Бандарчык В.К. Выбраныя працы па гістарыяграфіі паходжання і этнічнай гісторыі беларусаў: да 100-гадовага юбілею. – Мінск, 2020.
2. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск, 1985.
3. Чаквин И.В., Терешкович П.В. Из истории становления национального самосознания белорусов (XIV – начало XX в.) / И.В. Чаквин, П.В. Терешкович // Советская этнография. 1990. №6. С. 42–55.
4. Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. – Минск, 1991.
5. Дзермант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: навука і ідэалогія / А. Дзермант, С. Санько // ARCHE. №5. 2005. С. 233–253.
6. Беларусы. Том 4: Вытокі і этнічнае развіццё // В.К. Бандарчык, В.М. Бялявіна, Г.І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск, 2001.
7. Беларусы. Том 10: Славянскія этнакультурныя традыцыі / І.У. Чаквін, А.У. Гурко, Т.І. Кухаронак. – Мінск, 2007.
8. Терешкович П.В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы / П.В. Терешкович. – Минск, 2004.
9. Бялявіна В.М., Ракава Л.В. Жаночы касцюм на Беларусі. – Мінск, 2007.
10. Бялявіна В.М., Ракава Л.В. Мужчынскі касцюм на Беларусі. – Мінск, 2007.
11. Килбас А.А. Культура привилегированного сословия в Беларуси (XIV–XVI вв.): монография / А.А. Килбас. – Минск, 2004.
12. Шыдлоўскі С.А. Культура прывіліяванага саслоўя Беларусі: 1795–1864 гг. – Мінск, 2011.
13. Батяев В.Ф. Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е годы XX века. Этнологическое исследование / В.Ф. Батяев; под научн. ред. А.И. Локотко. – Минск, 2007.
14. Раюк А.Р. Этнасацыяльная структура беларускага грамадства і шляхі сацыяльнай мабільнасці ў 1772–1863 гадах: аўтарэферат дысертацыі на суісканне вуч. ст. канд. гіст. навук: спецыяльнасць 07.00.07 этнаграфія, этналогія і антрапалогія. – Мінск, 2009.
15. Яшчанка А.Р. Гомель у другой палове XIX – пачатку XX ст.: гісторыка-этнаграфічны нарыс. – Гомель, 1997.
16. Верашчагіна А.У., Гурко А.В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. – Мінск, 1999.
17. Гурко А.В. Конфессиональная ситуация в Республике Беларусь: этнический и исторический аспекты. – Минск, 2001.
18. Гурко А.В. Новые религии в Республике Беларусь: этнологические исследования. – Минск, 2003.
19. Беларусь. Этнічныя супольнасці / А.В. Гурко [і інш.]. – Мінск, 2017.
20. Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем / А.В. Гурко [и др.]. – Минск, 2010.
21. Этнокультурные процессы Гродненского Понеманья в прошлом и настоящем / А.В. Гурко [и др.]. – Минск, 2014.
22. Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем / А.В. Гурко [и др.]. – Минск, 2016.
23. Этнокультурные процессы Белорусского Подвинья (Витебщины) в прошлом и настоящем / А.В. Гурко [и др.]; науч. ред. А.В. Гурко; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., Ин-т этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск, 2017.
24. Этнокультурные процессы Западного Полесья (Брестчины) в прошлом и настоящем / А. Вл. Гурко [и др.]; науч. ред. А. Викт. Гурко; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры, языка и лит., этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск, 2020.
25. Титов В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов. – Минск, 1983.
26. Локотко А.И. Историко-культурные ландшафты Беларуси. – Минск, 2006.

# Працоўна-земляробчая абраднасць беларусаў у святочнай культуры





Пытанне традыцыйнасці ў культуры паўстае апошнім часам у сувязі з новымі механізмамі трансфармацыі ў розных яе сферах. Традыцыя – гэта нізка повязяў сучаснага з мінулым, калектыўная памяць супольнасці, яна вызначае сталасць функцыянавання формаў культуры і такім чынам наяўнасць фактараў, што забяспечваюць яе аднаўленне. Існаванне такіх фактараў (стэрэатыпаў) звязана з перыядычным паўтарэннем пэўных сітуацый і патрэб (К.В. Чистов. «Традиция и вариативность», «Советская этнография». №2. 1983). У дачыненні да земляробчай абраднасці сітуацыя, якая паўтараецца, ёсць прыродны гадавы сельскагаспадарчы цыкл; патрэба, што трывала захоўваецца, – неабходнасць забяспечыць ураджай.

Найважнейшым з'яўляўся традыцыйны беларускі жніўны святочна-абрадавы комплекс, які складаўся з трох паслядоўных этапаў: зажынак, жніва і дажынак, уключаў разнастайныя звычаі, песні, гульні, прыкметы, вераванні, што мелі рэгіянальна-лакальныя адметнасці. Выпрацаваны вякамі народны каляндар дапамагаў селяніну вызначыць найлепшы час для пачатку і заканчэння сельскагаспадарчых работ, прадказаць надвор'е на бліжэйшы дзень і на пэўную пару года, паклапаціцца пра будучы ўраджай. Кульмінацыйны момант працоўнага года селяніна – жніво. Сакральны статус хлеба ў беларусаў надзвычай высокі, спрадвечна ён з'яўляецца нечым большым, чым проста прадуктам харчавання, гэта – сімвал Божага благаславення, жыцця, долі, паказчык дабрабыту, гаспадарлівасці, заможнасці сям'і, таму працы па яго вырошчванні поўніліся і пазаўтылітарнымі сэнсамі, а ўласна жніво станавілася адным з самых адказных перыядаў, усведамлялася як своеасаблівая вяршыня абраднасці і працы, увасоблены вынік усяго каляндарнага года.

Пачатак і заканчэнне ўборкі ўраджаю ўрачыста адзначаліся не толькі сельскай грамадой, але і ў кожнай сям'і. Асноўны сэнс абрадава-магічных дзеянняў заключаўся ў тым, каб падзякаваць боствам, духам, продкам за дапамогу ў вырошчванні і зборы ўраджаю





**Таццяна Кухаронак,**
старшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

і адначасова паклапаціцца пра будучы ўраджай, здароўе, дабрабыт і працяг роду. Да жніва вяскоўцы рыхтаваліся як да вялікага свята: гаспадыня вымывала хату, бажніцу, стол, лавы, гаспадар прыбіраў панадворак, гумно, стол засцілалі белым абрусам.

У большасці выпадкаў зажынкі з адпаведнымі рытуаламі выконваліся ў першы дзень жніва і непасрэдна адкрывалі працу. Для зажынак выбіралі гэтак званы лёгкі дзень: суботу ці пятніцу. Вялікія патрабаванні прад'яўляліся да зажынальніцы, бо ўдалы яе выбар забяспечваў поспех усёй грамадзе. Самыя першыя жмені яна клала не ў сноп, а асобна на полі, у выглядзе крыжа. У некаторых лакальных традыцыях пачатак працы сімвалізавала выкананне жніўнай песні. На Беларусі быў распаўсюджаны звычай перавязваць спіну перавяслам, завязваць чырвоную нітку, каб захаваць здароўе падчас цяжкай працы. У многіх вёсках вешалі перавясла на прыдарожны крыж, што было візуальным знакам жніва. Каля першага снапа частаваліся прынесенай ежай. Вечарам у дзень зажынак у сям'і ладзілі святочную вячэру.

Для большасці раёнаў Беларусі быў характэрны звычай нажынаць першы сноп. Паводле традыцыйных уяўленняў, ён з'яўляўся сімвалам пачатку чарговага цыкла земляробчай працы, стаяў у хаце на самым ганаровым месцы – покуці. У некаторых раёнах яго першым заносілі ў гумно, прывёзшы з поля першы воз высахлых жытнёвых снапоў. Збожжа з яго было прынята дабаўляць да насення падчас засевак наступнага ўраджаю.

Праз некаторы час пасля ўрачыстых зажынак пачыналася жніво – цяжкая шматдзённая праца, якая забірала ў жней амаль усе фізічныя і душэўныя сілы. У гэты час апраналіся і абуваліся так, каб было зручна працаваць. У адзенні аддавалі перавагу светлым колерам. Песня была дзейсным сродкам падтрымання і ўзнаўлення фізічных сіл і псіхалагічнай раўнавагі жней. У некаторых лакальных традыцыях бытаваў звычай кожны вечар, скончыўшы работы, пакідаць на ноч на недажатай ніве крыж з каласоў як знак абароны нівы. Мужчыны ў час жніва дапамагалі жонкам.

Жалі доўга, па 2–3 тydні, напружанне і стома ўсё накопліваліся, і нарэшце наступаў апошні дзень працы. Трэба было аддзячыць ніве, што вырасціла хлеб, усім вядомым нябесным і зямным сілам, духам, продкам і паклапаціцца пра новы ўраджай, забяспечыць прыхільнасць духа палёў на наступны год. У знак падзякі паўсюль на Беларусі пакідалі на полі некалькі нязжатых каласоў, з якімі абыходзіліся з вялікай любоўю, стваралі з іх канструкцыі-ўпрыгожванні з адметнымі назвамі ў розных вёсках: «барада», «раёвая барада», «спарышова барада», «раёк», «дзед», «ніўка», «спажня», «спарыня», «чубок», «перапёлка», «каза», «каса», «кукла», «куст», «кветка», «дажынкі». На «бараду» звычайна пакідалі куст самага лепшага жыта. Па традыцыі апошнюю яго жменю выразала жанчына-зажынальніца.

Выпалаўшы, рабілі ўласна «бараду», а варыянтаў было даволі шмат: звязаныя ўверсе каласы; звязаныя сцябліны без каласоў; заплеценыя ў выглядзе касы; завязаныя ў вузел; у выглядзе букета з каласоў. Каласы завівалі справа налева. «Бараду» палівалі вадой, каб не было засухі, абвязвалі поясам, упрыгожвалі кветкамі, каснікамі, сцяблінамі травы, гронкамі рабіны і іншай зелянінай. На зямлю паміж каласамі рассцілалі белую хусцінку, клалі хлеб і соль, яйкі, каменьчыкі і прасілі багатага ўраджаю на наступны год. Скончыўшы працу, жнеі каля завітай «барады» клаліся на зямлю, каб на будучы ўраджай жыта было добрае і калоссе гнулася да зямлі, качаліся па полі, перакочваліся праз «бараду»,





«каб на лета жыта трубой каціласся». Акрамя таго, качанне/кулянне мела і прафілактычную мэту: качаліся, «каб спіна не балела», каб вярнуць страчаныя на жніве сілы: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку на другую ніўку». «Барада», паводле вераванняў беларусаў, была знакам падзякі і садзейнічала адраджэнню прадукцыйных сіл зямлі: «Хлеб-соль лажылі, нада зямлю паблагадарыць, што дала ўражай» (Клічаўскі раён). Лічылася, што яго частку патрэбна было пакінуць у полі як дарункі для Бога: «Пакінулі Богу на бараду»; «Іллю на бараду кінула»; «Купіна жыта – Богу». Таксама верылі, што пакінутыя на ніве каласкі зберагуць сабраны ўраджай ад мышэй.

Як завівалі «бараду», то вязалі яшчэ і апошні дажынкавы сноп «гаспадар», «спадар», «каляда», «квітка», які быў звычайнага памеру ці крыху большы за зажынкавы, а ў некаторых вёсках – зусім маленькі снопік у адну жменю каласоў, якія звязвалі чырвонай стужкай, скручвалі ў выглядзе вянка ці крыжа. На Гродзеншчыне апошні сноп (дзеда) вязалі ў выглядзе антрапаморфнага пудзіла. Яго, як і першы, упрыгожвалі, урачыста неслі дахаты, ставілі на ганаровым месцы побач з зажынкавым, пасля іх асвячалі ў царкве/касцёле на адно з восеньскіх рэлігійных свят, а зерне бралі на засеўкі, «каб кажды год радзіў такі ўражай, як з гэтага снапка», бо, паводле традыцыйных вераванняў, зярняты апошняга снапа лічыліся найбольш урадлівымі.

У некаторых рэгіёнах Беларусі, перш за ўсё на Панямонні, Падзвінні, ва Усходнім Палессі, быў шырока распаўсюджаны звычай па заканчэнні жніва плесці яшчэ і дажынкавы вянок з калосся, дадаючы ў яго палявыя і папяровыя кветкі, ягады рабіны, каліны, каснікі, часта – зрэзанае з «барады» калоссе. Вянок перавconfigured важна быў круглы, па памеры галавы. У асобных вёсках яго плялі толькі вопытныя жнеі, бо гэта патрабавала вялікага майстэрства і вынаходлівасці. Падчас працэсу спявалі дажынкавыя песні. Часцей вянок завівалі пры завяршэнні калектыўнай працы запрошаныя на талаку жнеі і ўручалі або надзявалі на шыю гаспадару з пажаданнем здароўя і будучага добрага ўраджаю, дадаткова яшчэ яго і доўгім перавяслам перавязвалі ў знак пашаны. Гаспадар дзякаваў жнеям, даваў ім грошы і абавязкова ладзіў застолле. У некаторых вёсках ён, атрымаўшы дажынкавы вянок, абліваў старшую жняю вадой, каб пасадзейнічаць багатаму ўраджаю на наступны год. З гэтай жа мэтай аблівалі жней вадой і аднавяскоўцы. Дажынкавы вянок захоўваўся як «святая» рэч. Дажынкі ў кожнай сям'і або калектыўна завяршаліся святочным застоллем, якое было асабліва ўрачыстым і вясёлым – скончана цяжкая праца, убрана поле, будзе хлеб, а значыць, будзе жыццё.

Шматлікія звычаі, абрады, вераванні, прыкметы, уяўленні, што суправаджалі зажынкі і дажынкі, жніўныя атрыбуты – першы і апошні сноп, дажынкавы вянок – доўгі час захоўваліся і пры калгасным ладзе, іх жнеі ўручалі кіраўнікам гаспадарак, якія па традыцыі абавязаны былі пачаставаць працаўніц, зладзіць для іх гулянне.

Традыцыі зажынак і дажынак, якія звязаны з земляробчым календаром, і ў сучасны перыяд падтрымліваюць спрадвечныя ідэалы працавітасці беларусаў, дэманструюць вялікую ролю прафесіі хлебароба ў і афіцыйнае прызнанне іх заслуг на дзяржаўным узроўні. Сёння абраднасць зажынак значна трасфармавалася. Іх абавязковымі кампанентамі з'яўляюцца зажынанне самай паважанай жанчынай у вёсцы ўручную першага снапа, уручэнне яго кіраўніку гаспадаркі, выкананне абрадавых песень, блаславенне пачатку жніва святаром, добрыя пажаданні камбайнёрам. Зараз найчасцей зажынкі праводзяцца ў тых гаспадарках, дзе ёсць зацікаўленыя ў гэтым кіраўнікі і фальклорныя калектывы, актывізаваўся ўдзел святароў у гэтым мерапрыемстве.

Сучасныя дажынкі на Беларусі – афіцыйнае свята, якое мае новую форму, звязаную са своеасаблівым пераасэнсаваннем і адраджэннем элементаў традыцыйных працоўна-земляробчых абрадаў у межах сучаснай культуры. Яно праводзіцца з 1996 г. як Рэспубліканскі фестываль-ярмарка працаўнікоў вёскі, а з 2014 г. яго фармат змяніўся на лакальны – фестываль арганізуецца ў адным з раённых цэнтраў кожнай вобласцю самастойна. Сцэнар уключае ў сябе святочнае шэсце ўсіх удзельнікаў па цэнтральнай вуліцы горада і выхад на цэнтральную плошчу. Наперадзе калоны два юнакі і дзве дзяўчыны ў беларускіх нацыянальных строях нясуць разгорнуты сцяг фестывалю-ярмаркі – светла-зялёнае палотнішча з эмблемай – залатымі калоссямі. На плошчы ўзнагароджваюць лепшых камбайнёраў, шафёраў, пераможцаў спаборніцтва на жніве, уручаюць ім каштоўныя падарункі. Сцэна ўпрыгожваецца традыцыйным атрыбутам жніва – снапом. Кожнаму фестывалю спадарожнічаюць канцэрты, выставы работ народных умельцаў, кулінарных вырабаў, дзіцячай творчасці, ладзяцца народныя гульні і забавы, праводзяцца розныя спартыўныя спаборніцтвы, працуюць ярмаркі.

Земляробчая абраднасць беларусаў з'яўляецца своеасаблівым спосабам умацавання працоўных традыцый, духоўных каштоўнасцей народа. Дажынкі таксама поруч з іншымі дзяржаўнымі святамі садзейнічаюць грамадскай салідарнасці, этнакультурнай інтэграцыі, структураванню культурнага жыцця.

# ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

## ў сістэме жыццезабеспячэння беларускага народа (канец XX – пачатак XXI ст.)





**Галіна Каспяровіч,**
вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, дацэнт

**Анатацыя.** *У артыкуле на матэрыялах этнаграфічных даследаванняў, архіўных і статыстычных крыніц прааналізавана захаванне традыцый жывёлагадоўлі ў Рэспубліцы Беларусь.*

**Ключавыя словы:** *традыцыі, навацыі, культура жывёлагадоўлі, тыпы гаспадарак, сістэма жыццезабеспячэння.*

Жывёлагадоўля – адна з жыццёва важных, сістэмаўтваральных галін аграрнай эканомікі, якая стабільна забяспечвае насельніцтва прадуктамі харчавання, лёгкую прамысловасць – сыравінай, займае важнае месца ў экспарце малочнай і мясной прадукцыі, тым самым умацоўвае нацыянальную харчовую бяспеку краіны. Нагадаем, што само слова «жывёла» (жывацiна, жывёлiнка), у свой час атаясамлівалася са словам «жывот» (жывёла – жываты), адным з сэнсаў якога было само жыццё [1]. Характэрна, што традыцыйная культура жывёлагадоўлі як частка этнічнай культуры народа фарміравалася і адшліфоўвалася на працягу многіх стагоддзяў, у працэсе адаптацыі да прыроднага асяроддзя і зменлівых сацыяльна-эканамічных умоў жыцця. Яна грунтавалася на ўнікальнай сістэме традыцыйнага прыродакарыстання, багатым практычным вопыце, народных ведах, а таксама духоўна-маральных каштоўнасцях, якія забяспечвалі ўстойлівасць вядзення аграрнай гаспадаркі. Ва ўмовах інтэнсіўных працэсаў глабалізацыі ў грамадстве палемізуюцца пытанні аб ролі традыцый і інавацый. Адны лічаць, што традыцыі пераважна звязаны з мінулым, перашкаджаюць абнаўленню. Другія – і іх большасць – падкрэсліваюць высокі маральны, гуманістычны патэнцыял традыцый. Пад апошнімі звычайна разумеюць унікальную і шматбаковую з'яву, якая ўключае навыкі і ўменні, светапогляд, звычаі, абрады, характэрныя рысы этнасу, якія перадаюцца ад аднаго пакалення да другога, пераходзяць у спадчыну нашчадкам [2], а таксама агульнапрыняты парадак, правілы, якія спрадвеку ўкараніліся ў побыце народа [4].

У 2019 г. выйшла з друку калектыўная кніга беларускіх этнолагаў «Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі», у якой на багатых архіўных, статыстычных, літаратурных крыніцах, палявых этнаграфічных, анкетных матэрыялах паказана эвалюцыя гэтай галіны ад старажытных часоў да сучаснасці,

даследаваны захаванне і мадэрнізацыя традыцый па ўтрыманні і доглядзе, узнаўленні і селекцыі свойскай жывелы, выхаванні маладняку, нарыхтоўцы і захаванні кармоў, характарызуюцца светапоглядныя ўяўленні беларусаў аб свойскай жывёле, святы, звычаі, народныя веды, практычны вопыт, звязаныя з жывёлагадоўляй. Кніга багата ілюстравана арыгінальнымі фотаздымкамі, табліцамі і графікамі, картасхемамі, малюнкамі [5]. Заключная глава прысвечана заканамернасцям і фактарам развіцця жывёлагадоўлі ў сучасны перыяд (канец XX – пачатак XXI ст.) у трох тыпах гаспадарак (аграпрамысловых арганізацыях, падсобных сялянскіх і фермерскіх гаспадарках), кожны з якіх займае сваю нішу ў забеспячэнні харчовай бяспекі краіны. Калі ў буйных сельскагаспадарчых мадэрнізаваных аб'яднаннях пераважна наладжана вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі, культывіруюцца збожжавыя і кармавыя культуры, то ў структуры фермерскіх гаспадарак дамінуе раслінаводства. Сялянскія гаспадаркі забяспечваюць свае патрэбы – і часткова рыначныя – у экалагічнай прадукцыі, у іх пашырана развядзенне свіней, птушкі, трусоў, пчалаводства.



У Рэспубліцы Беларусь прыярытэтную ролю ў забеспячэнні харчовай бяспекі краіны адыгрываюць сельскагаспадарчыя арганізацыі. На аграпрамысловых комплексах сканцэнтравана пераважная большасць свіней, птушкі, буйной рагатай жывёлы. Развядзенне апошняй традыцыйна займае вядучае месца ў галіне. Па дадзеных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у разліку на душу насельніцтва па вытворчасці мяса наша краіна зраўнялася з Германіяй (113 кг у год), а па вытворчасці малака – перавышае ўзровень развітых еўрапейскіх краін (708 кг). Надоі малака ў сярэднім ад кожнай каровы з 2002 па 2017 г. павялічыліся ў два разы. У пачатку XXI ст. у галіну прыйшлі новыя тэхналогіі гадавання, кормавытворчасці, кармлення. За апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі істотна абноўлена інфраструктура малочнай жывёлагадоўлі, пабудавана і мадэрнізавана звыш 1 тыс. малочна-таварных ферм. Шырока разгарнулася селекцыйная праца па замене чорна-пярэстай жывёлы гальштынізаванай пародай. Надзвычай важным фактарам, які ўплывае на вытворчыя паказчыкі, з'яўляецца якасны догляд за жывёлай, клопат аб ёй. Аналіз палявых этнаграфічных матэрыялаў, газет і часопісаў сельскагаспадарчай накіраванасці сведчыць аб значнасці чалавека на вытворчасці, асабліва высокатэхналагічнай: кіраўнікоў гаспадарак, вядучых спецыялістаў, кіраўнікоў сярэдняга звяна, аператараў машыннага даення, жывёлаводаў, пастухоў і работнікаў сумежных сельскагаспадарчых прафесій. Традыцыі чалавечых адносін да жывёлы пераходзяць і на высокатэхналагічныя фермы, дзе сёння пануюць белыя халаты аператараў машыннага даення, камп'ютары і аўтаматыка [6].





Традыцыйнай галіной з'яўляецца свінагадоўля, галоўныя накірункі якой – мясны, беконны і мясасальны. У выніку плённай працы навукоўцаў НПЦ НАН Беларусі па жывёлагадоўлі, селекцыянераў краіны выведзены беларуская мясная, беларуская чорна-рабая пароды свіней. У гэты час быў задзейнічаны генетычны патэнцыял імпартных мясных парод (гемпшырская, ландрас, дзюрок). Актыўна развівалася птушкагадоўля. Асобныя

традыцыі захоўваюцца і ў гадаванні свіней і птушак. На сучасным комплексе свінні знаходзяцца на глыбокай саламянай падсцілцы, а на птушкафабрыках на змену антыбактэрыяльным прэпаратам прыйшлі прабіётыкі і фітапрэпараты.

На жаль, значна зменшылася роля авечкагадоўлі, конегадоўлі. Згодна з Рэспубліканскай праграмай развіцця авечкагадоўлі на 2012–2016 гг., Дзяржаўнай праграмай развіцця аграрнага бізнесу ў Рэспубліцы Беларусь на 2016–2020 гг. галіна ўзнаўляецца. У сучасным айчынным аграрным комплексе конегадоўля набывае пераважна племянны і спартыўны накірунак. Маюцца 3 конныя заводы, каля 30 конеферм, дзе займаюцца развядзеннем, захаваннем і ўдасканальваннем конскіх парод (беларускай запражной, рускай цяжкавознай, рускай рысістай), вырошчваннем высакакласнай спартыўнай жывёлы і племянных вытворнікаў для конеферм. У генафондных гаспадарках краіны захоўваецца таксама пагалоўе коней палескай папуляцыі. У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі, 5 цэнтрах алімпійскага рэзерву, 13 дзіцяча-юнацкіх школах па конным спорце займаюцца звыш 1600 спартсменаў, працуюць 88 штатных трэнераў.

Падсобныя сялянскія гаспадаркі, (іх у 2016 г. налічвалася каля 1 млн па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі можна суаднесці з сёмай вобласцю Рэспублікі Беларусь. Тут гадуецца 3,7% кароў, 10,6% свіней, 57,6% коней, 63,6% авечак, 96,5% коз, 90,9% трусоў, 8,6% птушкі, 83,1% пчоласем'яў (2020 г.). Яны вырабляюць кожнае шостае яйка, 3,5% малака, 4,5% мяса, 64,7% воўны ад усёй вытворчасці [7].

У структуры фермерскіх гаспадарак (2794, 2020 г.) толькі 8,4% складае прадукцыя жывёлагадоўлі. Іх вага ў агульным аб'ёме вытворчасці невялікая: па малаку – 0,4%, рэалізацыі жывёлы і птушкі – 0,7%, па яйках – 0,04%. Разам з тым у фермерскіх і падсобных гаспадарках найбольш поўна захоўваюцца традыцыі жывёлагадоўлі (стаўленне да жывёлы, кармленне, лячэнне, узнаўленне). Багаты вопыт і навыкі передаваліся з пакалення ў пакаленне, становячыся ўплывалі на такія найважнейшыя рысы беларускага народа, як працавітасць, памяркоўнасць, адказнасць, разважлівасць. Вялікае значэнне маюць эканамічныя функцыі хатніх гаспадарак, якія выпрацоўваюць экалагічна чыстыя прадукты харчавання.

Аналіз развіцця жывёлагадоўлі ў сучасны перыяд паказаў, што яна, нягледзячы на розныя формы ўласнасці і ўзроўні іх мадэрнізацыі, па-ранейшаму захоўвае свае базавыя асновы (галіновую структуру, спецыфіку гаспадарання), грунтуецца на духоўна-маральных каштоўнасцях у адносінах да сельскагаспадарчай жывёлы. Каляндарныя святы і абрады, якія непасрэдна былі звязаны з гаспадарчай дзейнасцю беларускага народа, прыкметна трансфармаваліся. Калі старэйшае пакаленне захоўвае рацыянальныя веды, навыкі, абрадавыя практыкі, то ў светапоглядзе моладзі, з аднаго боку, звужаецца сфера іх выкарыстання, з другога – актуалізуецца пісьмовы шлях набыцця ведаў па жывёлагадоўлі (спецыяльная літаратура, даведнікі, інтэрнэт-рэсурсы і інш.). З савецкага часу захоўваюцца традыцыі конкурсаў, спаборніцтваў аператараў машыннага даення і іншых спецыялістаў аграрнай вытворчасці, вечары-ўшанаванні перадавікоў, працоўных дынастый. З'яўляюцца новыя святы, якія грунтуюцца на традыцыях, сярод іх – фестывалі Беларускага каня, экафестывалі («Спораўскія сенакосы») і інш.



Традыцыі гаспадарчай дзейнасці беларусаў адаптуюцца да новых умоў, захоўваючы свае асновы, спрыяюць перадачы адвечнага ладу жыцця, вопыту і ведаў у вядзенні сельскай гаспадаркі, стэрэатыпаў паводзін, фарміраванню духоўна-маральных якасцей асобы, выхаванню любові да роднай зямлі, вырашэнню праблем і задач харчовай бяспекі беларускага народа.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 21 / А.М. Булыка [і інш.] / Пад рэд. А.М. Булыкі. – Мінск, 2002.
2. Даль В.И. Толковый словарь великорусского языка. Т. IV. / В.И. Даль. – М., 1955.
3. Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. Т. II. / В.И. Даль. – М., 1955.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. Г-К / Рэд. А.Я. Баханькоў. – Мінск, 1978.
5. Традыцыі жывёлагадоўлі Беларусі / Г.І. Каспяровіч [і інш.]; навук. рэд. Г.І. Каспяровіч. – Мінск, 2019.
6. Субат У. Святло нязгасных зорак // Сельская газета. – 2016. 19 сакавіка.
7. Сельское хозяйство Республики Беларусь. Стат. сборник / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск, 2020.

# Выхаванне дзяцей у сучаснай сям'і



**Любоў Ракава,**
вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар гістарычных навук



**Ты пакуль што – быццам тая дзічка ў гаі,**
**На якую аніхто і не зважае.**
**Прышчапі ж галінак – з розуму і цноты,**
**З веры ў Бога шчырай, з дабраты, пяшчоты,**
**Гэткіх дасць яна пладоў!**

*М. Рэй з Нагловіц*

У гэтых словах польскага паэта ярка гучыць думка пра тое, што менавіта выхаванне спрыяе фарміраванню ў дзецях лепшых чалавечых якасцей, і гэтую ролю эфектыўна можа ажыццяўляць сям'я. «Хто дзяцей мае – хай навучае»,– гаворыцца ў народнай прыказцы. Узнаўленне культуры пасляхова можа забяспечваць самая ўспрымальная сацыяльная група – маладое пакаленне, а таму выхаванне яго ў сям'і з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснасці. Тым больш, як сцвярджаў К. Д. Ушынскі, «выхаванне, створанае народам і заснаванае на народных пачатках, мае такую вялікую сілу, якой няма ў самых лепшых сістэмах, заснаваных на абстрактных ідэях або запазычаных у іншага народа» [2].



У традыцыйным грамадстве сям'я выступала найважнейшым сацыяльным інстытутам, эфектыўна ажыццяўляючы працэс узнаўлення насельніцтва, выхавання і сацыялізацыі дзяцей у культуры этнасу. Беларусы надавалі гэтаму важнае значэнне з даўніх часоў. Пра тое сведчаць актавыя дакументы XVI ст., галоўным чынам тэстаменты (завяшчанні), дзе кіраўнік сям'і, напрыклад, просіць жонку выхаваць сваіх сыноў і дачок «на навуках», «годна і богобойне», гэта значыць, на базавых жыццёвых прынцыпах. Сучасная беларуская сям'я перажывае глыбокія змены, многія з якіх маюць дэструктыўны характар, калі яна падвяргаецца разбурэнню і губляе свае найважнейшыя функцыі або не можа выконваць іх цалкам. Так, у сучаснай сістэме выхавання адбываецца зрушэнне каштоўнасных арыенціраў, калі важныя функцыі сям'і (адказнае бацькоўства, навучанне жыццёвым навыкам, традыцыям узаемадапамогі, супрацоўніцтва і інш.), як гэта было традыцыйна, замяняюцца на новыя, прагматычныя. Прыкметна памяншаецца колькасць людзей, якія знаходзяцца ў шлюбе, распаўсюджваецца мода на бяздзетнасць, павялічваецца колькасць разведзеных.

Мадэрнізацыя сучаснай сям'і, якая адбывалася ва ўмовах паскарэння НТП, урбанізацыі, нарастання напружання рытму жыцця, росту адукацыйнага ўзроўню жанчын і іх занятасці ў грамадскай вытворчасці, павышэнне правоў і свабод зрабілі становішча мужа і жонкі незалежнымі і аўтаномнымі. А гэта, у сваю чаргу, істотным чынам паўплывала на зніжэнне паказчыкаў структуры сям'і: памяншэнне шлюбнасці і рост незарэгістраваных шлюбаў, разводаў, а таксама зніжэнне нараджальнасці да мінімальнага і вельмі небяспечнага парога, што сведчыць пра крызіс і прагрэсіруючае скарачэнне росту насельніцтва.

Варта адзначыць, што дзяржавай прадпрымаецца шэраг мер для павелічэння нараджальнасці ў краіне (закон «Аб дэмаграфічнай бяспецы ў Рэспубліцы Беларусь»).

Усе часцей выхаваннем дзяцей займаецца толькі жанчына. Пра гэта ў сярэдзіне мінулага






*Мал. 1.* У якой сям'і вы гадаваліся?

стагоддзя папярэджвала амерыканская даследчыца Маргарэт Мід, якая адзначала, што «выхаванне дзяцей у пагражаючых памерах стала жаночай справай» [1]. Пры гэтым жыццё часткай моладзі не ўспрымаецца як цяжкасць, бо яны ўпэўнены, што ім павінны дапамагаць бацькі. Ускладняе задачу выхавання і сацыялізацыі моладзі нуклеарызацыя сем'яў, распаўсюджванне саюзаў з адным з бацькоў, а таксама нізкая адказнасць іх часткі за гэты важны працэс або ўхіленне ад яго зусім. Сацыёлагі такі тып сям'і называюць постсучаснай, або шлюбнай, дзе галоўным звяном выступаюць шлюбныя адносіны. Роля бацькоў у выхаванні дзяцей у такіх сем'ях істотна зніжаецца. Як правіла, у іх існуе эканамічная і грамадзянская эмансіпацыя жонкі ад мужа і расце эмансіпацыя дзяцей ад бацькоў.

Негатыўным фактарам з'яўляецца і адмоўнае сальда міграцыі, калі ў іншыя краіны з'язджае значная частка маладых спецыялістаў, многія з якіх не вяртаюцца. На жаль, гэтая тэндэнцыя ўзмацняецца.

Вялікую ролю ў выхаванні сучасных дзяцей адыгрываюць сацыяльныя сеткі, на наведванне якіх траціцца большая частка часу маладых. Як сцвярджаюць эксперты, 96% наведваюць сайты і верацсь дэманстраваным у іх канспіратыўным тэорыям, відэа і фэйкам. У апошнія гады рэзка павялічылася колькасць моладзі і дзяцей, якія «праседжваюць» велізарную колькасць часу ў Інтэрнэце, што замяняе жывыя зносіны з аднагодкамі, дарослымі, настаўнікамі і аслабляе навыкі жыцця ў рэальным свеце.

Сумную карціну можна бачыць штодня ў метро і іншых грамадскіх месцах: маладыя людзі і дзеці не выпускаюць з рук мабільныя тэлефоны па шляху на заняткі, школьнікі стаяць уздоўж сцен у калідорах падчас перапынкаў і няспынна праглядаюць паток інфармацыі ў гаджэтах. Залежнасць ад Інтэрнэту спараджае мноства праблем, прыводзіць да страты духоўных асноў. Не ўсе бацькі імкнуцца навучыць дзяцей пераадольваць цяжкасці і прымаць самастойныя рашэнні, а залішні іх клопат, імкненне да таго, каб у дзяцей было ўсё лепшае – праца, кватэра, грошы і інш.,– пазбаўляе іх самастойнасці.




*Мал. 2.* Ці з'яўляецца для вас прыкладам сям'я бацькоў?

У апошняе дзесяцігоддзе ў выніку росту ўплыву моладзевай субкультуры, сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі сучасная сям'я паступова страчвае статус асноўнага інстытута сацыялізацыі дзяцей і адчувае цяжкасці ў трансляцыі культурных каштоўнасцей этнасу маладому пакаленню. Пры гэтым менавіта яна мае самы вялікі духоўны патэнцыял, дзе закладваюцца маральна-этычныя арыенціры асобы, якія перадаюцца з дапамогай традыцый як асноўнага сродку трансляцыі сацыяльна-культурных каштоўнасцей, нормаў, вопыту, а таксама ўстанаўлення сувязяў, уключаных у сферу яе жыццядзейнасці. Відавочна, што выхаванне дзяцей на нацыянальна-культурных скарбах з'яўляецца найбольш эфектыўнай умовай развіцця духоўна-маральнага аблічча нацыі. Мы бачым, як моцна змяніліся традыцыі выхавання і каштоўнасці, якія ляжалі ў іх аснове. На жаль, не ўсе сучасныя бацькі вырошчваюць у дзецях самастойнасць, дабрыню, сумленнасць, працавітасць, адказнасць, ветлівасць, спагадлівасць, а таксама ўменне выжываць, прымаць адказныя рашэнні адносна свайго жыцця. Менавіта гэтыя якасці былі распаўсюджанымі ў беларусаў у мінулым.

У 2018 г. у рамках праекта «Трансгранічная этнакультурная супольнасць (па матэрыялах беларуска-расійскага памежжа)» было праведзена апытанне 187 студэнтаў трох ВНУ рэспублікі: Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Ф. Скарыны і Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. Куляшова па тэме «Этнакультурныя працэсы на беларуска-рускім




*Мал. 3.* Што вы больш за ўсе цэніце ў сваей сям'і?

памежжы», дзе блок пытанняў быў прысвечаны сям'і, узаемаадносінам яе членаў, традыцыям выхавання, культуры і інш.

Па дадзеных апытання, 81,2% рэспандэнтаў выраслі ў поўнай сям'і з абодвума бацькамі, 18,8% – у сем'ях з адным з іх (часцей з маці) *(мал. 1)*. На пытанне аб тым, хто займаўся выхаваннем, большасць рэспандэнтаў (167) адзначылі маці, 118 – бацьку. Невялікую ўдзельную вагу (7 адказаў) склалі сем'і, дзе выхаваннем займаліся бабуля, дзядуля, айчым, сястра і інш. На пытанне: «Ці з'яўляецца для вас узорам сям'я бацькоў?» атрыманы адказы: для больш чым паловы апытаных (53,6%) – «так», для 24,4% – «не», 22% апытаных не змаглі адказаць альбо не вызначыліся дакладна з адказам *(мал. 2)*. Гэта вельмі сімптаматычна, таму што можа сведчыць аб існуючых у сям'і праблемах, а таксама аб тым, што яна не служыць у поўнай меры ўзорам для значнай часткі дзяцей і, такім чынам, не валодае досыць высокім статусам.

У сучасным грамадстве дзеці сталі аб'ектам клопату і моцнай прыхільнасці бацькоў, дзе інтарэсы і патрэбы першых ставяцца вышэй за ўсё. У апошняй чвэрці XX ст. пачаўся працэс эмансіпацыі дзяцей ад бацькоў, які стаў вядучай тэндэнцыяй у пачатку XXI ст., а дзетацэнтрызм як каштоўнасная арыентацыя дарослых у сям'і актуальны і сёння. Адбыўся пераход ад пазіцыі жорсткага кантролю, падпарадкавання, апекі бацькоў над дзецьмі да прадастаўлення ім большай самастойнасці ў выбары жыццёвага шляху з нязменнай падтрымкай дзяцей бацькамі, ахове іх правоў. Разам з нуклеарызацыяй сем'яў, зніжэннем нараджальнасці паступова адбываліся змены ў перадачы традыцыйнага педагагічнага вопыту беларусаў, які сёння па большай частцы лічыцца састарэлым, а таму выкарыстоўваецца менш.

Прыкметны і рост эмансіпацыі дзяцей ад бацькоў. Назіраюцца адхіленні сучасных сямейна-шлюбных адносін ад традыцыйнага ладу. Многія народныя высновы сямейнага выхавання сыходзяць у мінулае. А ў тых, што засталіся, актуалізуецца інавацыйная функцыя, калі гістарычны ўзор не проста капіруецца, а пераасэнсоўваецца і развіваецца ў адпаведнасці з патрэбамі сённяшняга дня. У сучасным грамадстве адбываецца страта маральных арыенціраў часткай моладзі, што прыкметна ўплывае на зніжэнне дзетнасці. У выніку расце нязводльнасць маладых людзей да сямейнага, духоўнага жыцця, адбываецца разбурэнне сямейных каштоўнасцей, фізічнага і ментальнага здароўя, што ў канчатковым выніку перашкаджае ім стаць гарманічна здаровымі і шчаслівымі людзьмі *(мал. 3)*. Існуе такая страшная пагроза фізічнаму і псіхічнаму здароўю дзяцей, як страта цікавасці да жывых зносін і сыход у віртуальную рэальнасць, якая спецыялістамі ўжо кваліфікуецца як вельмі сур'ёзнае і цяжкае захворванне.

У сучасным грамадстве прыкметна зніжаецца роля бацькоў у выхаванні дзяцей перш за ўсё з-за нізкай адказнасці іх часткі перад сваімі абавязкамі, рацыяналізацыяй свядомасці, разлікам на прагматычныя каштоўнасці. Прыкметна вырасла ў краіне колькасць няпоўных сем'яў з адным з бацькоў (часцей з маці), дзе адсутнічае ўзор узаемадзеяння бацькоў паміж сабой.

Варта адзначыць, што дынамічныя працэсы, якія адбываюцца сёння ў грамадстве і сям'і, развіццё камунікатыўна-інфармацыйных тэхналогій не толькі выклікалі глыбокія сацыяльна-эканамічныя перамены, але і абвастрылі праблемы выхавання дзяцей, іх сацыялізацыю. На жаль, сям'я паступова страчвае статус асноўнага інстытута выхавання з-за рэзкай змены ўмоў жыцця пакаленняў, росту ўплыву на гэты працэс сродкаў масавай інфармацыі, маладзёжнай субкультуры і г.д. Таму актуальнай праблемай сучаснасці выступае захаванне і адраджэнне лепшых народных традыцыйных формаў і асаблівасцей выхавання, выдатных педагагічных традыцый, якія і сёння могуць заставацца велізарным інтэлектуальным багаццем нацыі.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Мид М. Культура и мир детства: избранные произведения / М. Мид; пер. с англ. – М., 1988.
2. Ушинский К. Д. Собр. соч.: в 11 т. – М., Л., 1948. Т. 3.

# Традыцыйны сялянскі касцюм у кантэксце моды



**Валянціна Бялявіна,**
старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук



Традыцыйны святочны касцюм селяніна. Хутар Ліп'е Драгічынскага раёна Брэсцкай вобл., пач. XX ст.

Касцюм (адзенне, галаўныя ўборы, абутак, аксесуары) на працягу многіх стагоддзяў з'яўляўся той часткай матэрыяльнай культуры, якая візуальна найбольш ярка ўвасабляла нацыянальную адметнасць беларусаў. Ён быў адзнакай сацыяльна-маёмасных і саслоўных адрозненняў, полаўзроставай і сямейнай дыферэнцыяцыі, паказваў узаемаадносіны з культурай суседніх народаў. У традыцыйным грамадстве ён разам з утылітарным прызначэннем выконваў абрадавую, магічную і эстэтычную функцыі. Цесна звязаны з прыроднакліматычнымі ўмовамі, узроўнем вытворчых сіл і культурай, касцюм адлюстроўваў складаны шлях гістарычнага развіцця беларускага этнасу.

Традыцыйны сялянскі касцюм, асноўныя тыпы якога сфарміраваліся ў феадальную эпоху, быў у значнай ступені аднародным на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Яго найбольш характэрнымі рысамі былі перавага белага колеру ў асноўным і верхнім адзенні; нашэнне мужчынскіх сарочак навыпуск; нешырокія нагавіцы, калашыны якіх запраўлялі ў боты або анучы (пры хадзьбе ў лапцях); адметны крой верхняй вопраткі; самабытныя спосабы павязвання жаночых ручніковых галаўных убораў; спецыфічны тып плеценага абутку; своеасаблівы арнамент вышыванага і тканага аздаблення.

Добра прыстасаваны да земляробчай працы касцюм беларускіх сялян мала змяняўся ва ўмовах, калі сын паўтараў жыццёвы шлях бацькі, а дачка – маці, займаючыся тымі ж гаспадарчымі заняткамі і карыстаючыся тымі ж прыладамі працы. Яго гістарычнае раз-



Жаночы комплекс адзення. Вёска Дражна Бабруйскага павета Мінскай губ., 1911 г. Фота І. Сербава

віццё да сярэдзіны XIX ст. ішло толькі па шляху паступовай мадыфікацыі элементаў, пашырэння каляровай гамы, фарміравання рэгіянальных касцюмных комплексаў.

Кожны селянін меў два варыянты адзення: штодзённае і святочнае. Звычайна ў хаце, на працы і ў дарозе апраналіся сціпла і даволі функцыянальна, а ў царкву і на святы надзявалі святочныя строі, якія часта ўражвалі сваёй прыгажосцю, пластычнай выразнасцю, вытанчаным упрыгажэннем вышыўкай або ўзорным ткацтвам.

Вышыўка (вышыванне) была адным з абавязковых жаночых заняткаў, якому вучылі з дзяцінства. Пераемнасць традыцый ішла ад маці да дачкі, ад бабулі да ўнучкі. Перадаваліся не толькі прыёмы майстэрства, але і арнаментаваныя вышыўкай прадметы са старажытнымі ўзорамі. Гэта забяспечвала засваенне вопыту папярэдніх пакаленняў і з'яўлялася асновай глыбокай традыцыйнасці беларускай народнай вышыўкі. Часцей за ўсё вышываннем займаліся дзяўчаты, якія павінны былі да свайго вяселля вышыць сарочку жаніху і некалькі ручнікоў для сватоў і будучай радні. Вышывалі чырвонымі ніткамі па белым палатне простага перапляцення.

Найбольш старажытнай і працаёмкай тэхнікай беларускай народнай вышыўкі быў набор («нацяг», «нацягванне»), які адносіцца да агульнаславянскіх прыёмаў шыцця. Такой вышыўкай упрыгожвалі жаночыя ручніковыя галаўныя ўборы («намёткі»), хусткі, дзявочыя галаўныя павязкі («скіндачкі»), жаночыя і мужчынскія сарочкі, фартухі, паясы. На тэрыторыі Заходняга Палесся вышыўкай аздаблялі таксама світы («латухі») і кажухі.

Аснову вышыўкі складаў геаметрычны арнамент, які бытаваў у той ці іншай ступені паўсюдна на Беларусі. Галоўныя яго элементы – прамыя і зігзагападобныя лініі, крыжы, прамавугольнікі, трохвугольнікі, квадраты, васьміпялёсткавыя разеткі з дамінацыяй ромба і яго шматлікіх па канфігурацыі вырыянтаў. Археолаг М. М. Чарняўскі ў 1970-х гг. звярнуў увагу на тое, што арнаменты, якія ўпрыгожваюць знаходкі з пасяленняў неаліту і бронзавага веку на тэрыторыі краіны, пераклікаюцца з традыцыйнымі беларускімі арнаментамі. Аднак паміж арнаментаванымі археалагічнымі помнікамі, дзе кожны з геаметрычных знакаў меў пэўны сімвалічны сэнс, і найбольш старымі захаванымі ўзорамі народнай вышыўкі, якія адносяцца да сярэдзіны XIX ст., пралягае вялізны гістарычны перыяд. За гэты час фігуры арнаменту страцілі значную частку старажытнай сімволікі, набылі новы змест і спарадзілі вялікую колькасць вытворных форм. Але беларускія майстрыхі змаглі захаваць і пранесці праз шматлікія стагоддзі асноўныя прыкметы



Селянін у святочным касцюме. Вёска Масток Магілёўскага павета Магілёўскай губ., канец XIX – пачатак XX ст.

арнаменту – колер, характар, лакальнае размяшчэнне ўзораў.

Больш доўгаму, чым у іншых усходнеславянскіх народаў, захаванню ў беларусаў старажытных матываў вышыўкі і яе абярэгавай сімволікі садзейнічала наяўнасць вялікіх масіваў лясоў і балот, неразвітасць шляхоў зносін, патрыярхальнасць ладу жыцця і асаблівая прыхільнасць да традыцый даўніны. Па сведчаннях даследчыкаў, яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. у некаторых мясцовасцях Беларусі бытаваў абрад «прачытання» вышыўкі ў час агледзін нявесты, калі старая жанчына паказвала прысутным вышытыя нявестай сарочкі і растлумачвала значэнне кожнага ўзору.

Беларускі мастацтвазнаўца М. С. Кацар падчас экспедыцыйных паездак у 1930-х гг. па розных рэгіёнах Беларусі высветліў, што большасць узораў геаметрычнага арнаменту традыцыйнай беларускай вышыўкі і бранага ткацтва ўтрымліваюць геаметрызаваныя сімвалы славянскіх язычніцкіх багоў: Жыценя, Ярылы, Перуна, а таксама сімвалы Сонца, вялікай багіні Маці-Зямлі і шэрага іншых вобразаў беларускай міфалогіі. Пры гэтым, на думку ткачых і вышывальшчыц, яны валодалі вялікай аберагальнай сілай.



Фестываль-конкурс беларускай моды і мастацтва «Этна Стыль», 2016 г.

Для народнай вышыўкі другой паловы XIX – пачатку XX ст. быў характэрны каларыт, у якім чырвоны колер дапаўняўся нязначнымі ўкрапленнямі сіняга або чорнага колеру на фоне белага палатна.

Этнографы А. К. Сержпутоўскі, М. Я. Нікіфароўскі, Е. Р. Раманаў, П. В. Шэйн шматкратна ўзгадвалі ў сваіх працах пра выкарыстанне з апатрапейнай мэтай чырвоных паясоў, нітак, стужак, вышытых жаночых ручніковых галаўных убораў у вясельных, радзінных, пахавальна-памінальных абрадах беларусаў.

Як і ўсе ўсходнеславянскія народы, беларусы ўпрыгожвалі вышыўкай строга вызначаныя часткі прадметаў адзення. Вышыты або тканы арнамент на святочных мужчынскіх і жаночых сарочках мы бачым вакол каўняра, на абшлагах, па краі падола. Па меркаванні вучоных, кругавое размяшчэнне вышыўкі, магчыма, з'яўляецца праяўленнем старажытнага магічнага круга – сімвала абароны заключанага ўнутры яго аб'екта. Вышыўка, якая аберагала галаву, размяшчалася вакол шыі, арнаментацыя нізу фартуха і падола жаночых сарочак, верагодна, павінна была засцерагаць дзетародныя органы. Вышыўка на паліках (плечавых устаўках) і па рукавах сарочкі прызначана была зберагаць сілу, а дэкарыраванне абшлагоў захоўвала спрытнасць рук, павялічвала іх працаздольнасць.



Фестываль-конкурс беларускай моды і мастацтва «Этна Стыль», 2016 г.

Будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі чыгунак, развіццё адыходных промыслаў, рост гарадоў і ўплыў гарадской культуры разбуралі патрыярхальнасць жыцця вёскі і садзейнічалі інтэнсіўным зменам у народнай вышыўцы. З 1870-х гг. у Расіі пачалі выходзіць танныя друкаваныя выданні, дзе змяшчаліся малюнкі для вышывання і «ўзорнікі», якія шырока прадаваліся ў лаўках і крамах Беларусі, шмат арнаментальных кампазіцый рабілася на ўпакоўцы розных тавараў. Пад уздзеяннем гэтых працэсаў вялікую папулярнасць набыў шоў крыжам («крыжык просты»). Параўнальная лёгкасць і хуткасць выканання вышывак крыжам стала адной з галоўных прычын выцяснення старажытных відаў вышыўкі. Геаметрычны арнамент стаў імкліва замяняцца раслінным, і ў вышыўцы ўсталяваўся чырвона-чорны каларыт з амаль роўным выкарыстаннем чырвоных і чорных нітак.

Нягледзячы на тое, што вясковыя жыхары да 1930-х гг.,

а на Палессі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, не ўяўлялі сабе святочнага адзення без арнаментацыі яго вышыўкай і ўзорным ткацтвам, вышыўка яўляла сабой ужо спалучэнне розных па часе арнаментальных комплексаў, страціла апатрапейную сімволіку і ўспрымалася толькі як мастацкае аздабленне рэчы.

У сучасных умовах глабалізацыі, распаўсюджання масавай культуры і фармалістычных плыняў у мастацтве ва ўсіх народаў узрастае цікавасць да сваёй гісторыі і нацыянальнай культурнай спадчыны, у тым ліку да традыцыйнага касцюма, ткацтва і вышыўкі.

Беларускія дызайнеры адзення ствараюць вырабы з улікам нацыянальнай спецыфікі, у якіх народны арнамент творча перапрацоўваецца ў адпаведнасці з колерам касцюма, яго кампазіцыйнай будовай і прызначэннем. У Мінску стаў традыцыйным фестывальконкурс беларускай моды і мастацтва «Этна Стыль», у ім прымаюць удзел дызайнеры і прадпрыемствы, якія мадэліруюць і выпрацоўваюць адзенне ў стылі этна. Вялікім паказам калекцый па матывах нацыянальнай культуры ў 2018 г. адзначыў свой 70-гадовы юбілей Беларускі цэнтр моды. Паспяхова прапагандуюць нацыянальныя рысы ў сучасным адзенні, традыцыйныя прыкладныя тэхнікі і арнамент мадэлі, выкананыя мадэльерамі Беларускай палаты моды.

У апошнія гады вышытыя нацыянальным арнаментам світшоты, мужчынскія сарочкі, алімпійкі, майкі сталі ў краіне сапраўдным модным трэндам. Яшчэ ніколі ў беларусаў зварот да нацыянальных вытокаў не быў такім імклівым і масавым.

Беларускі арнамент вядомы і за межамі краіны. Дызайнеры моднага дома Valentino (Італія) у 2015 г. паказалі калекцыю адзення, у якой дэкарыраваныя беларускай народнай вышыўкай сукенкі і касцюмы ўразілі публіку і выклікалі захапленне прыгажосцю нашага арнаменту.

Ужо чатыры гады запар у Мінску і рэгіёнах праходзяць Дні вышыванкі, мэта якіх – папулярызацыя культуры беларусаў, захаванне нацыянальнага адзінства і нацыянальнай ідэнтычнасці. У 2020 г. удзельнікі свята ў сталіцы маглі прыняць удзел у конкурсе «Азбука вышыванкі», паглядзець дэфіле мадэляў у касцюмах з элементамі вышыўкі ад беларускіх дызайнераў і вытворцаў адзення. Акрамя таго, на маштабнай інтэрактыўнай экспазіцыі «Фолк-кірмаш» госці пазнаёміліся з народнымі абрадамі, традыцыйным касцюмам і народнымі промысламі, якія прэзентавала кожная вобласць рэспублікі. У Брэсце ў мінулым годзе свята адзначылі велапрабегам, а ў Лідзе зрабілі фотапраект «Вышыванка на вуліцах нашага горада». Напярэдадні свята па ўсёй краіне праходзілі тэматычныя мерапрыемствы: флэшмоб «Усе ў вышыванках», акцыі «Падары нованароджанаму вышыванку», «Падары вышыванку сябру», тэматычныя выставы і паказы ў музеях, бібліятэках, кінатэатрах.

Такім чынам, у сучаснай Беларусі, як і ва ўсім свеце, расце цікавасць да сваіх этнічных вытокаў і нацыянальных каштоўнасцей. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгрываюць традыцыйны касцюм і народны беларускі арнамент, што наглядна адлюстроўваецца нават на нашым пабытовым джынсава-пацёртым касцюме, які ўсё часцей дапаўняецца прадметамі з элементамі народнай вышыўкі.



Свята вышыванкі ў Брэсце, 1 ліпеня 2018 г.

# Сістэма харчавання беларусаў як частка этнічнай культуры



**Тадэвуш Навагродскі,**
загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ, доктар гістарычных навук, прафесар

Традыцыі харчавання – важная частка культуры этнасу. Яны найбольш трывала захоўваюць этнічную спецыфіку і ў меншай ступені схільныя да змен, таму выступаюць як важная крыніца пры даследаванні пытанняў гісторыі матэрыяльнай культуры і многіх іншых спрэчных пытанняў.

Актуальнасць вывучэння дадзенай праблематыкі звязана з вялікай практычнай значнасцю і запатрабаванасцю гэтай часткі культуры ў сучаснай сферы харчавання, а таксама яе выкарыстаннем у турыстычнай галіне нашай краіны. Традыцыі – візітная картка любога народа. Таму важна іх не толькі ведаць, але і папулярызаваць як важнейшы элемент спадчыны.

Традыцыйная культура харчавання ў цэлым даволі яскрава адлюстроўвае стан жыцця этнасу, яго гісторыю. Перыяды яго росквіту і развіцця можна прасачыць па асартыменце прадуктаў, якія выкарыстоўваліся, разнастайнасці ўжываных відаў страў, кулінарным майстэрстве і г.д. І наадварот: цяжкае эканамічнае становішча, перыяды разрух і войн, неўраджаяў, голаду значна збядняюць традыцыі ў галіне народнага харчавання, бо тады не звяртаецца ўвага на яго якасны стан, а даводзіцца думаць аб фізічным



выжыванні. У галодныя часы беларусы выкарыстоўвалі для ежы лебяду, акацыю, жалуды, гнілую мёрзлую бульбу, а то і проста «нішчымніцу». Разам з тым можна заўважыць, што ў неспрыяльных, экстрэмальных сітуацыях часам адбываецца зварот і вяртанне многіх народных кулінарных прыёмаў і традыцый, што раней выйшлі з ужытку.

Наогул яны з'яўляюцца лёгка ўзнаўляльнымі, асабліва калі ёсць носьбіты, якія памятаюць іх і ў любы момант могуць даць ім шанец да жыцця. Часам бывае, што традыцыя амаль затухла і, здаецца, нават знікла. Аднак пры пэўных абставінах (часцей вымушаных) яна можа лёгка ўзнавіцца і жыць. Таму аб канчатковым выхадзе яе з ужытку можна гаварыць з вялікай доляй асцярожнасці.



Вячэра на Вясеннія Дзяды ў Лунінецкім павеце. Фота Ю. Абрэмскага

Традыцыі харчавання залежаць ад многіх фактараў: прыродна-геаграфічных, сацыяльна-эканамічных, гістарычна-культурных, а таксама сезонных. На іх уплываюць інтэнсіўнасць міжэтнічных кантактаў і культурнага ўзаемадзеяння народаў, а таксама наяўнасць і даступнасць зыходных сыравінных кампанентаў, узровень развіцця навыкаў і ведаў у галіне кулінарнага майстэрства і г.д.

Любыя падзеі, якія з'яўляюцца вельмі важнымі для грамадства ці для асобнага чалавека, не абыходзяцца без прыёму спецыяльнай ежы: дні нараджэння ці імяніны, вяселле, пахаванне, дзяржаўныя і рэлігійныя святы. Паводзіны чалавека, звязаныя са здабычай, захаваннем, прыгатаваннем і ўжываннем ежы, выходзяць за межы задавальнення біялагічных патрэб чалавечага арганізма і характарызуюцца разнастайнымі формамі культуры[1].

У традыцыйнай культуры харчавання ёсць дзве процілеглыя асаблівасці. З аднаго боку, яна характарызуецца ўстойлівасцю, нават у нейкай ступені кансерватыўнасцю (асабліва абрадавыя віды страў). З другога – менавіта ў галіне народнай кулінарыі добра бачныя міжэтнічныя сувязі на ўсіх узроўнях (выкарыстанне прадуктаў, тэхналогія прыгатавання, посуд і г.д.).

Для асобнага этнасу або часцей нават для пэўнага рэгіёна, населенага блізкімі па культуры этнасамі, характэрна свая, выпрацаваная стагоддзямі сістэма харчавання. Яе ўтварае сукупнасць наступных кампанентаў: наяўнасць асноўных прадуктаў і тыпы страў, спосабы апрацоўкі; дадатковыя інгрэдыенты (прыправы, дадаткі і г.д.); забароны і перавагі, а таксама правілы паводзін, звязаныя з прыгатаваннем і ўжываннем ежы. Па кожнай з гэтых катэгорый прыкмет любая канкрэтная сістэма харчавання можа мець шэраг лакальных варыянтаў. Так, напрыклад, наборы асноўных харчовых прадуктаў у пачатку XIX ст. мелі шэраг лакальных асаблівасцей. На Палессі і Паазер'і значнае месца ў рацыёне займала рыба, у цэнтральных рэгіёнах Беларусі, Падняпроўі, Панямонні – зерневыя, гародніна, у лясных раёнах – прадукты паляўніцтва, бортніцтва і збіральніцтва. У цэлым харчовы комплекс адлюстроўвае экалагічную адаптаванасць этнасу ці групы да канкрэтных умоў.

Адной з галоўных частак народнай кулінарыі з'яўляюцца стравы – аснова, тое, з чаго кожная трапеза складаецца. Яны найбольш хутка і адчувальна рэагуюць на змены ў гістарычным і сацыяльна-эканамічным развіцці. Пры этналагічным вывучэнні страў мэтазгодна рабіць іх класіфікацыю ў залежнасці ад складнікаў: мучныя, крупяныя, гароднінныя, малочныя, мясныя, рыбныя, з яек, грыбныя. Асобную групу складаюць напоі, у асноўным прызначаныя для задавальнення смагі. Акрамя таго, ёсць складовыя стравы, у якія ўваходзяць некалькі кампанентаў у розных спалучэннях. Так, традыцыйная беларуская мачанка (верашчака, пражаніна) мае ў складзе муку, ваду, соль, сала, каўбасу, свіныя рэбры, цыбулю, перац.

Вельмі важным прадуктам на працягу многіх стагоддзяў быў печаны жытні хлеб. З крупяных

страў найбольш пашыранымі былі кашы. З другой паловы XIX ст. пачынае актыўна выкарыстоўвацца бульба. Стравы з яе не знайшлі прымянення ў святочна-абрадавай культуры. Гэта тлумачыцца адносна познім іх укараненнем у сістэму харчавання беларускага этнасу, калі асноўныя элементы народнай святочна-абрадавай культуры былі ўжо сфарміраваныя. Стравы з прадуктаў збіральніцтва забяспечвалі чалавечы арганізм вітамінамі. Сярод мясных прадуктаў пераважнае месца займала свініна, з малочных – клінковыя сыры. Рыбныя стравы атрымалі найбольшае распаўсюджанне на Палессі і паўночна-заходнім Паазер'і. Грыбы выкарыстоўвалі ў ежу найбольш сушанымі. Сярод напояў былі распаўсюджаны хлебны квас, медавуха, узвар, піва. Традыцыйныя стравы ўжываліся ў штодзённым харчаванні, а таксама ў святочна-абрадавым жыцці беларусаў.

Пры вывучэнні тэхналогіі прыгатавання ежы мэтазгодна звярнуць увагу на этнічныя асаблівасці пэўных прыёмаў і спосабаў, а таксама на прадметы хатняга начыння. Даследаванняў этнолагаў у гэтым кірунку значна менш, чым звязаных з іншымі бакамі матэрыяльнай культуры беларусаў, ды і разглядаліся яны ў асноўным пры апісанні страў. Сярод спосабаў і прыёмаў прыгатавання найбольш вядомыя варка, пячэнне, тушэнне, тамленне і г.д., прычым асноўная бінарная апазіцыя праходзіць па восі «сырое – прыгатаванае». Так, для традыцыйных прыёмаў беларускай народнай кулінарыі характэрна выкарыстанне вялізных непадзеленых мас – запяканне цэлай нагі (кумпяк), цэлага страўніка, цэлай гусі, цэлай рыбіны – або, наадварот, змяльчэнне, драбненне, расціранне прадукту, гэта значыць ператварэнне яго яшчэ да цеплавой апрацоўкі ў сечаную масу, фарш, пюрэ незалежна ад таго, мяса гэта, гародніна ці грыбы. Прыкладам страў, прыгатаваных першым спосабам, больш старажытным, з'яўляюцца пячыста, кумпяк, смажаная гусь і г.д. Другі спосаб характэрны для позняга часу, але менавіта ён атрымаў у беларускай кулінарыі найбольшае развіццё (дранікі, клёцкі, камы і г.д.)

Этнічная спецыфіка большасці традыцыйных кулінарных тэхналогій палягае ў тым, што часта з якога-небудзь аднаго вельмі простага і даступнага прадукту (жытняй мукі, аўса, бульбы, свінога мяса) пры складанай, адносна працяглай і звычайна камбінаванай (халоднай і цёплай) апрацоўцы атрымліваецца многа разнастайных смачных страў. Значнае месца займалі прадукты, якія надалі традыцыйнай культуры харчавання беларусаў непаўторнасць і адметнасць – прываркі, волагі, закалоты, забелы, закрасы і прысмакі. Важную ролю ў працэсе прыгатавання штодзённых страў адыгрывала соль. Саленне выкарыстоўвалі для захоўвання гародніны, мяса, рыбы, грыбоў і інш. Для традыцыйнай культуры харчавання характэрны спосаб квашання капусты, буракоў, яблыкаў. Пры гатаванні разнастайных страў – ад вельмі простых па тэхналогіі да самых складаных, якія патрабавалі значнага майстэрства і спрыту, – выключная роля адводзілася гаспадыні. Спажыванне ежы ў паўсядзённым жыцці адбываецца амаль заўсёды ў форме трапезы, пры пэўным спалучэнні страў і іх паслядоўнасці [2]. Звычайна трапеза складаецца з некалькіх відаў ежы, уключаючы напоі. Асноўную функцыянальную нагрузку



Выпечка хлеба ў хатняй печы, в. Тышковічы



Дранікі



Каравай

выконваюць штодзённыя прыёмы ежы. Яны ўтвараюць ядро ўсёй сістэмы харчавання этнасу. Святочная трапеза з самага пачатку ўзнікла як апазіцыя ў адносінах да штодзённай. Відавочна, што задавальняла патрэбы людзей менавіта апошняя. А для свят заўсёды характэрны больш багаты і разнастайны стол. У залежнасці ад часу прыёму трапез выдзяляюць ранішнія, дзённыя, вячэрнія; у залежнасці ад месца прыёму – хатнія, палявыя, у гасцях. Пры іх даследаванні як кампанента народнай кулінарыі пэўнага этнасу неабходна звярнуць увагу на іх колькасць (за дзень), час правядзення, склад удзельнікаў; зафіксаваць адрозненні, вызначыць паслядоўнасць, у якой ужываюцца розныя віды страў. Любая трапеза ўяўляе, нарэшце, дзеянне з пэўным знакавым зместам, таму з'яўляецца вельмі карыснай крыніцай для этналагічнага вывучэння.

Штодзённымі ў беларускай народнай кулінарыі з'яўляюцца снеданне, абед, полудзень (падвячорак), вячэра. Святочна-абрадавыя распадаюцца на дзве групы: трапезы, звязаныя са святамі каляндарнага цыкла (калядныя, велікодныя і г.д.) і сямейныя (радзінныя, вясельныя, памінальныя). У іх важную ролю адыгрывалі абрадавыя віды ежы – куцця, каравай, бабіна каша, клёцкі, канун. У асобную групу вылучаны трапезы, звязаныя з выкананнем гаспадарчых работ (талочныя, дажыначныя, засевачныя і г.д.), якія, на нашу думку, па сваім функцыянальным прызначэнні ўсё ж больш набліжаюцца да штодзённых. Прамежкавае становішча ў структуры займалі трапезы ў выхадныя дні – нядзельныя. Яны адрозніваліся больш разнастайнымі і складанымі стравамі, на прыгатаванне якіх можна было выдаткаваць больш часу.

Важна звярнуць увагу на вывучэнне народнага застольнага этыкету. Менавіта за сталом, калі збіраліся ўсе члены сям'і, перадаваліся ад старэйшага пакалення малодшаму вопыт, пэўныя веды, многія сямейныя традыцыі, засвойваліся нормы маралі і правілы паводзін. Характэрнай асаблівасцю беларускай народнай гасціннасці былі «прымус» і «прынука». У час застолля пасля падачы кожнай стравы гаспадары павінны былі запрашаць гасцей паспытаць яго са словамі: «Паспрабуйце, госці дарагія!», «Ешце на здароўе» і г.д. Калі гаспадар або гаспадыня дрэнна «прымушалі» гасцей есці стравы, то лічылася, што застолле было не вельмі ўдалым, і, вярнуўшыся з гасцей, гаварылі: «Усяго за сталом хапала: і ежы, і напояў, толькі прымусу не было» [3]. Падкрэсліваючы важнае значэнне гэтага ўнікальнага звычаю нашых продкаў, беларусы казалі: «Прымус і прынука – гасцінная штука!». Прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцей, пабываўшы ў гасцінным беларускім доме, таксама вельмі высока ацанілі гэтую асаблівасць: «Прынука і прымус – гасцінны беларус». І зараз у беларускіх вёсках пажылыя бабулі і дзядулі прытрымліваюцца гэтага трывалага звычаю. Нават выпадковага госця яны па традыцыі пастаянна запрашаюць паспытаць усіх страў, прапанаваных падчас трапезы. Асабліва на гэтую акалічнасць звяртаюць увагу ўнукі, якія ўлетку трапляюць да сваіх дзядуль і бабуль у сельскую мясцовасць з гарадскога асяроддзя. На жаль, у наш час у кропках грамадскага харчавання гэтай акалічнасці амаль


Сала


Паляндвіца


Кубелец з салам

не надаецца значэння. Праўда, ёсць некаторыя прыемныя выключэнні.

Прысутнасць госця мяняла агульны і звыклы ход трапезы, бо асноўная ўвага тады надавалася менавіта яму. Госця ў беларускай хаце садзілі на покуці, гэта значыць на самым пачэсным месцы, імкнуліся пачаставаць самым лепшым, што было ў хаце, а таксама выкарыстоўвалі далікатэсныя стравы (прысмакі). Этнаграфічныя крыніцы даюць шмат цікавых прыкладаў паважлівага стаўлення да госця. Так, звычаем прадугледжвалася пасля застолля абавязкова правесці госця на вуліцу ці нават за вароты. Калі здаралася, што падчас трапезы ў хату ўваходзіў чужы чалавек, то яго трэба было абавязкова пасадзіць і накарміць. Да гасцей таксама прад'яўляліся пэўныя патрабаванні. Як хто прыязджаў у госці, то сам ён не павінен быў заходзіць у хату, пакуль гаспадар не пакліча. У гасцях трэба быць вясёламу, гаваркому, бо гэта заўсёды падабаецца людзям. Есці ў гасцях трэба было памаленьку, часта класці лыжку на стол, чакаючы запрашэння [4].

Адной з асаблівасцей традыцыйнай культуры харчавання беларусаў з'яўляецца ўжыванне ў ежу экалагічна чыстых прадуктаў, тых, якія дае сама прырода і якія з'яўляюцца найбольш карыснымі для нашага арганізма, бо менавіта імі харчаваліся на працягу многіх стагоддзяў нашы продкі. У апошні час усё больш хвароб аказваюцца наўпрост звязанымі з нашымі перавагамі ў ежы і з пэўнымі прадуктамі (часцей за ўсё не характэрнымі для традыцыйнай кухні), якія мы штодня ўжываем. Сёння становіцца ўсё больш відавочнай неабходнасць харчавацца на аснове выпрацаваных народных традыцый.

Кулінарныя традыцыі беларусаў маюць сваю рэгіянальную спецыфіку. Часта бывае, што адна і тая ж страва нават у суседніх вёсках называецца па-рознаму, не кажучы ўжо аб розных гістарычна-этнаграфічных рэгіёнах. Гэтую спецыфіку і павінны ўлічваць мясцовыя гаспадыні. Неабходна фіксаваць кулінарныя традыцыі ад пажылых інфармантаў у тым рэгіёне, дзе размешчана аграсядзіба, адаптаваць бабуліны (дзядулевы) рэцэпты і навучыцца па іх гатаваць. Гэта выкліча зацікаўленасць не толькі ў замежных гасцей, але і ў айчынных наведвальнікаў.

Кулінарная спадчына беларусаў сёння запатрабавана ў сучаснай кухні, да яе праяўляюць цікавасць спецыялісты, а з развіццём агратурызму ў нашай краіне яна стала вывучацца і ўкараняцца ў практычнай дзейнасці гаспадарамі сельскіх сядзіб. Харчовы, ці гастранамічны турызм – папулярны сучасны кірунак. Знаёмства са стравамі народнай кухні, спосабамі і прыёмамі іх прыгатавання, з традыцыйнымі трапезамі, з народным застольным этыкетам, прадметамі хатняга начыння – важная частка праграмы для замежных турыстаў у нашай краіне. Развіццю турызму спрыяюць кулінарныя фестывалі. Так, напрыклад, у вёсцы Моталь Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці з 2008 г. праводзіцца Міжнародны кулінарны фэст «Мотальскія прысмакі», дзе свае здольнасці дэманструюць мясцовыя жыхары, спаборнічаючы ва ўменні прыгатаваць традыцыйныя стравы з выкарыстаннем магчымасцей хатняй печкі. Замежныя госці адзначалі натуральную аснову страў, іх разнастайнасць, незвычайны смак і карыснасць. «Еўрапейцам надакучыла есці парашкі, а тут мы ўбачылі натуральную сыравіну для страў»,– адзначаў галандскі кулінар-выдавец, старшыня журы першага Міжнароднага фестывалю «Мотальскія прысмакі». Такія кулінарныя фэсты садзейнічаюць прыцягненню замежных турыстаў у нашу краіну, а таксама спрыяюць актывізацыі інтарэсу да традыцый харчавання беларусаў.

Сёння неабходна арганізавана сабраць усе палявыя этнаграфічныя матэрыялы па кулінарнай спадчыне нашых продкаў і надрукаваць пад назвай «Народная кухня беларусаў». Некаторыя з іх ужо ўвайшлі ў этнаграфічныя зборнікі [5]. Поспех такой працы гарантаваны, тым больш што гэта была б сапраўдная беларуская кухня, якая рэальна бытавала і часткова бытуе ў асяроддзі вяскоўцаў. Сабраныя матэрыялы, акрамя практычнага выкарыстання ў дзейнасці гаспадароў аграсядзіб, работнікамі нацыянальных кавярняў і рэстаранаў, паслужылі б карыснай крыніцай для далейшага вывучэння традыцый харчавання беларусаў этнолагамі, фальклarystамі, лінгвістамі, краязнаўцамі і інш.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Добровольская М. В. Человек и его пища: пищевые специализации и проблемы антропогенеза.– М., 2005.
2. Навагродскі Т. А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў.– Мінск, 2000.
3. Навагродскі Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях.– Мінск, 2015.
4. Сержпутоўскі А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў.– Мінск, 1998.
5. Кулінарная спадчына Белавежжа.– Мінск, 2010.
6. Навагродскі Т. А., Захаркевіч С. А., Алюніна І. У. Народная кухня маталян.– Мінск, 2009.
7. Навагродскі Т. А., Захаркевіч С. А., Алюніна І. У. Народная кухня тышкаўцоў.– Мінск, 2010.
8. Навагродскі Т. А., Алюніна І. У. Народная кухня Гервятаў.– Мінск, 2011.
9. Навагродскі Т. А., Захаркевіч С. А., Алюніна І. У. Народная кухня Семежава.– Мінск, 2013.
10. Навагродскі Т. А., Захаркевіч С. А., Алюніна І. У. Народная кухня Лепельшчыны.– Мінск, 2017.

# Святочныя абрады хрысціян Беларусі





**Аляксандра Гурко (Верашчагіна),**
заг. аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,
доктар гістарычных навук

У незалежнай Беларусі за трыццаць гадоў існавання адбыўся працэс аднаўлення канфесійнай структуры і павышэння статуса рэлігіі ў дзяржаве і грамадстве. Па дадзеных на 1 студзеня 2020 г., у краіне налічвалася 25 рэлігійных напрамкаў і канфесій з агульнай колькасцю 3563 зарэгістраваных рэлігійных арганізацый [1]. Паводле дадзеных на ліпень 2010 г., прадстаўленых Апаратам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь, 58,9% насельніцтва лічаць сябе вернікамі [2]. Вядучае месца па колькасці вернікаў і абшчын традыцыйна займае праваслаўная царква, затым – каталіцкая і розныя накірункі пратэстанцтва.

Рэлігія і рэлігійны вопыт займаюць значнае месца ў жыцці сучаснага беларускага грамадства, пацверджанне чаму – насычанасць падзеямі царкоўнага жыцця і перапоўненасць храмаў падчас святочных набажэнстваў.

Хрысціянскія святы адзначаюцца большай часткай насельніцтва нашай дзяржавы. Закон «Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь», прыняты 19 снежня 1991 г. Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, прызнаў святочнымі вялікія даты праваслаўнага і каталіцкага календара – Вялікдзень, Радаўніцу і Раство Хрыстова. Указам Прэзідэнта №157 «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь» у 1998 г. яны ўвайшлі ў пералік дзяржаўных свят, сталі днямі адпачынку. Святы набываюць сучаснае свецкае абрамленне – падчас іх праводзяцца ўрачыстыя мітынгі і канцэрты, навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя вядомым дзеячам і знакамітым датам царкоўнай гісторыі. Абавязковыя элементы пры гэтым – святочныя прывітанні і наведванні храмаў кіраўнікамі дзяржавы; правядзенне кірмашоў і гулянняў па-за сценамі храмаў, асабліва ў буйных гарадах і, канечне, падрабязнае асвятленне падзеі ў сродках масавай інфармацыі.

Згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, у выкананні рэлігійных свят, абрадаў і таінстваў прымае ўдзел каля 15% насельніцтва Беларусі і каля 30% – ад агульнай лічбы вернікаў. Так, у святкаванні Вялікадня 7–8 красавіка 2007 г., дата якога была аднолькавая ў праваслаўным і каталіцкім календары, храмы Беларусі наведалі амаль 1,5 млн чалавек (па дадзеных МУС). У ноч на 7 студзеня 2012 г. па ўсёй Беларусі ўзялі ўдзел у набажэнствах

на свята Раства Хрыстова па праваслаўным календары каля 254 тыс. чалавек, па каталіцкім 24–25 снежня 2016 г. – больш за 113 тыс.

Як неад'емная частка культуры, хрысціянскія святы з'яўляюцца адным з элементаў, які фарміруе і складае этнічную самасвядомасць. Адбываецца значны ўплыў святочных хрысціянскіх традыцый на сучасныя этнічныя працэсы: беларусізацыю царкоўнага жыцця, фарміраванне нацыянальнага кліру, вядзенне набажэнства, справаводства і выпуск богаслужбовай літаратуры на беларускай мове, пераклад на яе тэкстаў Святога Пісання (пачатак гэтай традыцыі быў пакладзены яшчэ Францыскам Скарынам), а таксама фарміраванне нацыянальных асаблівасцей хрысціянскай святочнай традыцыі, якія звязаны са сваімі асабістымі рысамі ў абраднасці, ушанаваннем беларускіх святых, абразоў Божай Маці, прастольных свят (фэстаў) і свят, прысвечаных падзеям беларускай царкоўнай гісторыі.

Вялікае значэнне для этнічнай кансалідацыі і развіцця нацыянальнай культуры мае святкаванне памятных дат, звязаных з гісторыяй Беларусі і канфесій. Так, з пачатку 1990-х гг. зноў пачалі вылучаць значныя даты царкоўнай гісторыі, перш за ўсё – 1000-годдзе Праваслаўнай царквы ў Беларусі. Урачыста адзначалі 2000-годдзе хрысціянства, у гонар якога быў арганізаваны Міжнародны хросны ход. У 2005 г. Беларускай праваслаўнай царквой святкавалася 1000-годдзе Тураўскай епархіі. 9 жніўня 2013 г. ў Мінску – 1025-годдзе Хрышчэння Русі, у якім прынялі ўдзел больш за 500 тыс. чалавек.

У царкоўным жыцці праваслаўных вернікаў з'явіліся новыя святы, даты і падзеі, напрыклад Дзень праваслаўнай кнігі, які ў цяперашні час адзначаецца штогод. Яго станаўленне прымеркавана да даты выдання «Апостала» першадрукарамі дыяканам Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам 14 сакавіка 1564 г. Вяртаецца традыцыя будаўніцтва новых праваслаўных храмаў




*Мал. 1*. Колькасць рэспандэнтаў, якія суадносяць сябе з пэўнай канфесіяй

у гонар падзей гісторыі краіны і з'яўлення ў календары новых свят, з імі звязаных. Напрыклад, новы храм у гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» быў узведзены ў 1998 г. у памяць аб тых, хто пацярпеў ад Чарнобыльскай катастрофы, «каб штодня ўзвышаць малітвы пра іх». Такім чынам аднаўляецца старажытная традыцыя адзначаць смутныя падзеі ў жыцці дзяржавы [3].

Царкоўныя святочныя традыцыі дапаўняюцца новымі абрадавымі элементамі, звязанымі з высокім статусам рэлігіі ў грамадстве і прызнаннем царквы на дзяржаўным узроўні. Так, з праваслаўным святам Нараджэння Хрыстова пачынаючы з 1996 г. звязана ўручэнне спецыяльных званняў і прэмій «За духоўнае адраджэнне». У 1996 г. было ўсталявана дзяржаўнае свята «Дзень Маці», прымеркаванае да Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Як і ў даўніну, у гэтыя дні ладзяцца «Пакроўскія кірмашы». Усе рэлігійныя святы маюць даўнія традыцыі дабрачыннасці. Адноўлены старажытныя абрады, як, напрыклад, акунанне ў ваду на Вадохрышча. У 2015 г. ў Мінску акунуліся ў палонцы 30 тыс. чалавек.

Адбываецца працэс узнаўлення рэлігійнага жыцця, які адбіўся і на рэканструкцыі абрадавага боку – павялічылася колькасць паломніцтваў і аднаўляюцца святыя месцы, усталёўваюцца новыя святы і шанаванні святых. Да іх ліку Беларуская праваслаўная царква далучыла тых святароў, якія пацярпелі ад сталінскіх рэпрэсій. Іх сонм з кожным годам папаўняецца, ім прысвячаюцца новыя святы, спевы, абразы. У Сабор Беларускіх Святых увайшоў Рыгор Каніскі – праваслаўны арцыбіскуп Магілёўскі і Беларускі, філосаф, асветнік, культурны дзеяч XVIII ст. 22 ліпеня (9 па старым стылі) адзначаецца дзень святога праведнага Іаана Кармянскага, які нарадзіўся ў мястэчку Стрэшын на Гомельшчыне. У 2006 г. была кананізавана Валянціна Мінская. Нельга не адзначыць беларускіх святых, праслаўленых у мінулыя стагоддзі, перш за ўсё Еўфрасінню Полацкую і Кірылу Тураўскага.

Развіваецца агульная ўсходнеславянская традыцыя ўшанавання святынь – абразоў, крыжоў, якая была сфарміравана ў самым пачатку існавання хрысціянства. З крыжом звязана адно з найвялікшых свят апошняга часу, што адбылося 27 верасня 1997 г., калі ў старажытны Полацк быў вернуты згублены падчас Другой сусветнай вайны Крыж Еўфрасінні Полацкай, дакладней кажучы, яго адноўленая копія.



Раство Хрыстова ў Царкве ЕХБ Свет Евангелля. Мінск, 2015

Падобна да таго, як гэта адбывалася ў мінулых стагоддзях, у наш час шануюцца цудатворныя іконы Божай Маці, да якіх арганізуюцца паломніцтвы, святкуюцца дні іх з'явы. Напрыклад, да 500-годдзя Мінскага абраза Божай Маці, які змешчаны на гербе Мінска і стаў адным з сімвалаў сталіцы, быў пабудаваны храм на паўднёвым беразе Чыжоўскага вадасховішча.

Адбываецца ўзнаўленне каталіцкіх свят. У канцы XX – пачатку XXI ст. у каталіцкім календары па-ранейшаму займаюць найгалоўнейшае месца святы Раства Ісуса Хрыста і Вялікадня. Да іх у сучаснасці прымеркаваны апублікаваныя ў сродках масавай інфармацыі пастырскія пасланні з апісаннем зместу святочных падзей і віншаваннямі вернікаў Беларусі, а таксама прамыя трансляцыі па тэлебачанні святочных набажэнстваў з касцёлаў рэспублікі, з Рыма і Ерусаліма. Насычанае рэлігійнае жыццё сучасных вернікаў-каталікоў спалучае святы літургічнага года і дні, прысвечаныя ўшанаванню святых, якія вядомы з мінулага і кананізаваныя на працягу апошняга часу, напрыклад святому Андрэю Баболі. У 2003 г. былі беатыфікаваныя новыя святыя з Беларусі, сярод якіх – мучанікі часоў Другой сусветнай вайны. Узноўлена традыцыя ўшанавання цудатворных абразоў Божай Маці. Важным элементам адраджэння рэлігійнага жыцця каталікоў, асабліва марыйнага культу ў нашай краіне, сталі тры святыні, абвешчаныя малымі базылікамі: у Гродне (1991), Будславе (1993) і ў Пінску (1996), а таксама каранацыя папскімі каронамі чатырох цудатворных абразоў Панны Марыі: у Брэсце (1996), Лагішыне (1997), Будславе (1998) і Гродне (2005).

У сучаснай каталіцкай абраднасці з'яўляюцца новыя элементы, якія паступова становяцца неад'емнай часткай святочнага дзейства. Так, ужо традыцыйнымі сталі фестывалі духоўнай музыкі «Магутны Божа», што ладзіліся штогод у Магілёве Касцёлам разам са структурамі выканаўчай улады. Выпрацоўваюцца новыя абрадавыя элементы ў дзень святога Валянціна.

У сучаснай канфесіянальнай структуры беларускага грамадства значнае месца займаюць пратэстанцкія цэрквы. З пачатку 1990-х гг. жыццё айчынных пратэстантаў стала значна болей насычаным. Гэта быў перыяд арганізацыі сапраўдных хрысціянскіх свят, якія ўладкоўваліся ў Дамах культуры, на стадыёнах і ў іншых грамадскіх месцах. У пачатку XXI ст. атрымалі распаўсюджанне «вялікія евангелізацыйныя служэнні» – місіі, якія наведваюць з пропаведзямі розныя населеныя пункты Беларусі. Урачыста адзначаюцца памятныя даты гісторыі царквы, юбілеі памесных цэркваў. Так, на працягу 2003 г. пратэстанцкія арганізацыі святкавалі 450-годдзе Рэфармацыі на Беларусі. Святамі для вернікаў становяцца з'езды найбольш актыўных прадстаўнікоў пратэстанцкіх цэркваў. У сучаснасці яны актывізавалі місіянерскую і сацыяльна-духоўную дзейнасць, уносячы свой уклад у вырашэнне тых праблем, якія з'яўляюцца актуальнымі для нашага грамадства. Для пратэстантаў у Беларусі характэрнымі рысамі з'яўляюцца вельмі актыўная місіянерская дзейнасць, насычанае царкоўнае жыццё і разнастайная, аздобленая новымі сродкамі абраднасць.

Узнаўленне рэлігійных традыцый больш адметна ў сельскай мясцовасці. Гэты працэс знайшоў адлюстраванне ў адказах этналагічнага апытання, якое праводзілася сярод студэнтаў Магілёўскага, Гомельскага і Полацкага дзяржаўных універсітэтаў, ураджэнцаў сельскай мясцовасці ў 2015–2016 гг. [4]. Са 150 рэспандэнтаў агульная колькасць тых, хто суадносіць сябе з той ці іншай канфесіяй, дасягае 80–98% *(мал. 1).* Гэта значна




*Мал. 2.* Колькасць маладых рэспандэнтаў, у сем'ях якіх адзначаюцца рэлігійныя святы



Праваслаўная вербная нядзеля. Мінск, 2009. Фота В. Шэйбака



Яслі на Нараджэнне Хрыстова. Фарны касцёл у Гродне. 2020. Фота А. Гурко

больш, чым у цэлым па краіне (па розных дадзеных, 50–60%), і тлумачыцца тым, што вясковае насельніцтва мае больш высокі ўзровень рэлігійнасці, чым гарадское. Гэтаму спрыяюць рэшткі шматвекавой духоўнай культуры, якія захаваліся ў традыцыях земляробства і жывёлагадоўлі.

Аб значнасці хрысціянскіх свят у жыцці сучасных вернікаў сведчаць дадзеныя апытанняў сярод студэнцкай моладзі Магілёўшчыны, Віцебшчыны і Гомельшчыны [4]. Яны пацвярджаюць не толькі захаванне, але і адраджэнне на новым узроўні рэлігійных традыцый у насельніцтва Беларусі *(мал. 2)*: элементаў царкоўных свят, такіх як кірмаш і гулянні па-за сценамі храмаў, асабліва на вялікія рэлігійныя святы (Раство, Пасха, Спасы, Пакроў і г.д.), шанаванне рэгіянальных і агульнабеларускіх культаў святых (Еўфрасіння Полацкая, Манефа Гомельская, Кірыла Тураўскі, Іаан Кармянскі, Рыгор Каніскі і інш.), святынь (цудатворных абразоў, крыніц, храмаў, магіл святых); святкаванне падзей царкоўнай гісторыі.

У сучасным беларускім грамадстве адбываецца выпрацоўка новых рыс у дачыненні да хрысціянскага святочнага календара. Па дадзеных апытанняў, праведзеных этнолагамі ў 2010-х гг., высвятляецца, што ў большасці тых сем'яў, дзе была парушаная пераемнасць святочных традыцый, адбываецца іх узнаўленне з дапамогай сваякоў, знаёмых ці нават пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі. У тым выпадку, калі ў сям'і адсутнічаюць носьбіты традыцыі – старэйшае пакаленне – і да гэтага часу не адбылося «ўвацаркаўлення» больш маладога пакалення, усё ж назіраецца абуджэнне цікавасці да хрысціянскай традыцыі, якая пачынаецца менавіта са свят царкоўнага календара – шляхам уладкавання святочнага застолля, падрыхтоўкі рытуальных страў, віншаванняў, абмену падарункамі, а пазней і наведвання ўрачыстага святочнага набажэнства.

Традыцыйныя рэлігійныя святы выконваюць этнакансалідуючую і этназахавальную ролю ў жыцці народаў. Дзякуючы свайму аптымістычнаму пачатку (аптымізм, як падкрэсліваюць некаторыя даследчыкі, цяга да жыцця і яго працягу – адна з асноўных рыс свята), яны дапамагаюць выстаяць этнасу ў цэлым і асобным яго прадстаўнікам у цяжкія часы, у экстрэмальных умовах [5]. У 2020 г. падчас пандэміі кіраўнікі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў на вялікія святы – Пасху і Раство Хрыстова – звярнуліся да вернікаў з просьбай не наведваць храмы, а па магчымасці адсвяткаваць і выканаць усе святочныя рытуалы ў хатніх умовах. І ўсё ж галоўныя хрысціянскія святы былі адзначаны вернікамі Беларусі з надзеяй на выжыванне і ацаленне, з верай і малітвай да Бога [6, 7].

Можна зрабіць выснову, што хрысціянскія святы ў сучасным беларускім грамадстве ўтрымліваюць найбольш поўны і распрацаваны шлях да духоўнага самаўдасканальвання чалавека – і ў гэтым іх відавочная каштоўнасць.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Информация о конфессиональной ситуации в Республике Беларусь // https://www.belarus21.by/Articles/1439296790.
2. Религиозный состав населения Беларуси // https://www.bygeo.ru/materialy/naselenie-belarusi/426-religioznyj-sostav-naseleniyabelarusi.html.
3. Приход храма иконы Божией Матери «Всех скорбящих Радость» в городе Минске // http://hramvsr.by/kontacts.php.
4. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы НАН Беларуси. Ф. 6. Оп. 13. Д. 3.
5. Календарно-праздничная культура народов Зарубежной Азии: традиции и инновации / отв. ред. Р. Ш. Джарылгасинова. – М., 1997.
6. Елисаветинский монастырь будет доставлять на дом освященные вербы и пасхальные куличи // https://news.tut.by/society/680199.html.
7. Католики благословляли пасхальные блюда дома. Вот как это выглядело // https://news.tut.by/society/680244.html.

# Яўрэйскія святочныя традыцыі ў Беларусі



**Раман Мяшкоў,**
малодшы навуковы супрацоўнік
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
НАН Беларусі



Дзень Незалежнасці Ізраіля. Мінск, 2016.



Паводле дадзеных перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь 2019 г., на гэты час у краіне пражывае 13,7 тыс. яўрэяў (0,1% ад агульнай колькасьці) [1]. Паяўленне іх на тэрыторыі Беларусі адносіцца, па розных дадзеных, да XII–XIV стст. Яўрэі традыцыйна вызнаюць іўдаізм, таму большая колькасць святаў, якія яны адзначаюць, звязана з гэтай нацыянальнай, этнічнай рэлігіяй.

У рэспубліцы прадстаўлены літоўскі кірунак артадаксальнага іўдаізму, хасідызм (любавіцкі, карлін-столінскі) і прагрэсіўны іўдаізм. Да сучаснай рэлігійнай традыцыі беларускіх яўрэяў адносяцца наступныя святы і пасты: Шабат, Рош ха-Шана, Ём-Кіпур, Сукот, Шміні Ацэрэт, Сімхат Тора, Ханука, Ту бі-Шват, Пурым, Песах, Шавуот, Рош ха-Шана хасідызму, Гахнасат сэфер Тора, Дзявятага ава, Пост Гэдаліі, Дзясятага тэвета, Сямнаццатага тамуза, Пост Эстэр.

**Свята Шабат** адзначаюць у суботу. У гэты дзень забаронена выконваць любую працу, трэба спяваць песні, праводзіць трапезы; гучаць бласлаўленні; апранаюць светлую вопратку, весяляцца; забараняецца смуткаваць і пасціцца; траур перарываецца. Шабат мае сямейны характар. Асноўную частку рытуалаў здзяйсняюць у коле сям'і дома за святочным сталом.

1 і 2 тышрэя (верасень – кастрычнік) яўрэі святкуюць Новы год – **Рош ха-Шана**. У сінагогах трубяць у трубу шафар, выконваюць абрад ташліх: ідуць да ракі, выварочваюць кішэні ў знак пазбаўлення ад грахоў, выкідваючы крошкі хлеба рыбам. На Рош ха-Шана прынята есці яблыкі з мёдам, гранат, галаву рыбы.

**Ём-Кіпур**, або **Судны дзень** – адзін з найбольш важных яўрэйскіх свят і пастоў, які з'яўляецца кульмінацыяй дзесяці дзён пакаяння і прабачэння

грахоў (10 тышрэя). Да наступу паста беларускія яўрэі з'ядаюць курынае яйка, якое абмакваюць у попел, і крэплах (трохвугольныя пельмені). У гэты дзень забаронена есці, піць і мыцца. Да традыцый Ём-Кіпур адносяцца звычай прасіць ва ўсіх прабачэння, жадаць добрага запісу ў Кнізе Жыцця, лёгкага посту. У Ём-Кіпур праводзяць абрад капарот, згодна з якім мужчына павінен пакруціць над галавой пеўнем, а жанчына курыцай са словамі «Мае грахі пераходзяць на гэтую жывёлу». Затым птушку разразаюць, мяса аддаюць бедным. Нярэдка замест птушкі выступае рыба (карп) або грошы. Напрыклад, у суполцы літвакоў у Магілёве капарой выступаюць грошы, якія кладуць у скрыню ахвяраванняў [2].

Свята **Сукот** (у Беларусі носіць таксама назву «Кучкі») адзначаюць 15 тышрэя, па традыцыі будуюць сукку (будан) без даху, здзяйсняюць у ёй трапезу, трымаюць і трасуць святочны букет, які складаецца са звязаных разам 3 галін мірта, 2 галін вярбы, па адной галіне лулава (фінікавая пальма) і этрога (цытрон). Беларускія яўрэі карыстаюцца суккой у двары сінагог.

На **Сімхат Тора** (другі дзень Шміні Ацэрат) завяршаецца гадавы цыкл чытання Торы і пачынаецца новы. У гэтае свята ладзяць танцы, у тым ліку са скруткам Торы.

Свята **Ханука** доўжыцца 8 дзён з 25 кіслева (лістапад – снежань), усталявана ў памяць аб аднаўленні набажэнства ў Іерусалімскім храме і паспяховым паўстанні Іуды Макавея. На працягу 8 дзён запальваюць ханукію (васьмісвечнік), у дварах сінагог у Беларусі – металічныя электрычныя ханукіі. Свята Новага года дрэў – Ту бі-Шват – адзначаюць 15 швата (студзень – люты) у «Хэсэдзе», дома і ў абшчынным цэнтры, аддаючы перавагу садавіне, сухафруктам (фінікам) і арэхам.



Багаслужэнне ў сінагозе на Хануку. Мінск, 2019. Фота Р. Мяшкова.

Свята **Пурым** усталявана ў памяць аб выратаванні яўрэяў у Старажытнай Персіі ад знішчэння Аманам і святкуецца 14 адара (люты – сакавік). У сінагозе пры вымаўленні імя Амана прынята тупаць нагамі, крычаць і грымець трашчоткамі. З 1995 г. у Віцебску на Пурым каманды яўрэйскіх клубаў і суполак праводзяць міжнародны фестываль «Пуримшпиль в Витебске», прадстаўляючы на сцэне маскарадны спектакль з сюжэтам пра выратаванне яўрэйскага народа легендарнымі Мардэхаем і Эстэр. На Пурым гатуюць такія традыцыйныя стравы, як гаменташы (трохвугольнае пячэнне з макам) і крэплах, дораць адзін аднаму ежу і раздаюць падарункі бедным.

Свята **Песах**, усталяванае ў памяць аб Сыходзе яўрэяў з Егіпту, у Беларусі адзначаюць 8 дзён у месяцы нісан (сакавік – красавік). У традыцыі замацавана прыгатаванне і ўключэнне мацы ў пасхальную яўрэйскую трапезу (седэр), забарона на хамец, уборка дома. Падчас пасхальнага вечара чытаюць Агаду і праводзяць пасхальную трапезу – седэр. З 1950-х гг. беларускія яўрэі атрымліваюць пасылкі з мацой з Ізраіля, ЗША, Вялікабрытаніі і Канады [3].

Свята **Шавуот** прысвечана дарэнню Торы яўрэям на гары Сінай пры выхадзе з Егіпту і адзначаецца 6 сівана (май – чэрвень). У Шавуот прынята есці малочныя і мучныя стравы і ўпрыгожваць сінагогу зелянінай і кветкамі (бэзам). У сінагозе зачытваюць апавяданне пра дараванне Торы.

**Рош ха-Шана хасідызму**, або Свята вызвалення Альтэр рэбэ Шнэўра Залмана бар-Баруха з Лядаў з Петрапаўлаўскай крэпасці 27 лістапада 1798 г., святкуюць 19 кіслева выключна любавіцкія хасіды. Яны апранаюць святочнае адзенне, праводзяць хасідскія сходы (фарбрэнген) і ядуць грэцкую кашу.

Рэлігійныя яўрэі вераць, што кожны багаты яўрэй для выратавання душы абавязаны падрыхтаваць пергаментны скрутак Торы і ахвяраваць яго сінагозе. З гэтым звязана свята ўнясення новага скрутка Торы ў сінагогу – Гахнасат сэфер Тора.

Сямейныя традыцыі беларускіх яўрэяў звязаны з нараджэннем, абразаннем, рэлігійным паўналеццем, са шлюбам і смерцю.

На восьмы дзень пасля нараджэння хлопчыку праводзяць абрад абразання (брыт міла), які сімвалізуе саюз паміж Богам і народам Ізраіля і прыналежнасць яўрэя да народа Ізраіля. Абразанне мае не толькі рэлігійнае, але і нацыянальнае



Яўрэйскае вяселле (хупа). Бабруйск, 2018. Фота Д. Калініна.

значэнне, здзяйсняецца як рэлігійнымі яўрэямі, так і нерэлігійнымі. У нашы дні яго праводзяць у сінагозе, дома і медыцынскіх установах.

Хлопчыкі і дзяўчынкі дасягаюць рэлігійнага паўналецця адпаведна ў 13 і 12 гадоў. Іх называюць бар-міцва («сын запаведзі») і бат-міцва («дачка запаведзі»). У першую суботу па дасягненні 13 гадоў хлопчык упершыню завязвае тфілін (элемент малітоўнага адзення), атрымлівае статус «бар-міцва», прамаўляе бласлаўленне над Торай і чытае ўрывак з яе. З гэтага моманту хлопчык лічыцца дарослым, можа ўваходзіць у міньян (кворум з не менш чым дзесяці дарослых яўрэяў-мужчын старэй 13 гадоў), абавязаны выконваць усе міцвот (прадпісанні) і нясе адказнасць за свае ўчынкі [4]. Цырымонія ўступлення ў паўналецце дзяўчынак (бат-міцва) практыкуецца выключна у суполках прагрэсіўнага іўдаізму. Напрыклад, у Віцебску яна аналагічная бар-міцве ў хлопчыкаў, але часам абмяжоўваецца тым, што дзяўчынкі робяць даклад на рэлігійную тэму.

Адной з важных падзей у жыцці яўрэяў з'яўляецца яўрэйскі шлюб – хупа. Святочная трапеза яўрэйскага вяселля праводзіцца ў сінагозе, часам у рэстаране. Перад пачаткам вяселля складаецца шлюбны дагавор – ктуба. Затым маладыя становяцца пад балдахін (хупу), дзе жаніх надзявае нявесце заручальны пярсцёнак на ўказальны палец правай рукі. Першая страва, якую з'ядаюць муж і жонка,– курыны булён, або «залаты суп», паколькі курыца і певень лічацца сімвалам дзетараджэння.

Сярод супольных (грамадскія святы і дні памяці, якія адзначаюць у яўрэйскіх суполках) традыцый беларускіх яўрэяў вылучаюцца наступныя: Дзень незалежнасці Ізраіля, Дзень Іерусаліма, святкаванне прывілею літоўскага князя Вітаўта яўрэям Гродна ў 1389 г., дні нараджэння і юбілеі членаў суполкі, юбілеі суполак, дні нараджэння і памяці знакамітых беларускіх яўрэяў, Дзень памяці Катастрофы і гераізму, Дзень знішчэння Мінскага гета, дзень знішчэння Гродзенскага гета, Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту, удзел у Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур і Ночы музеяў. Большасць супольных свят і дзён памяці ўвайшлі ў святочную культуру ў канцы XX – пачатку XXI ст.

Дні нараджэння і юбілеі членаў суполкі адзначаюць ў абшчыннай сталовай у канцы месяца на Шабат. Імяніннікам співаюць песню-віншаванне «Ём хулэдэт», віншуюць «Мазаль тоў» і жадаюць жыць да 120 гадоў, што звязана з уяўленнямі пра сапраўднага яўрэя. Святкуюцца таксама дні нараджэння і памяці знакамітых беларускіх яўрэяў – Нахума Каплана, Льва Бакста, Марка Шагала [5]. Шэраг яўрэйскіх суполак праводзіць Ноч музеяў, напрыклад, у Гродне у зале Вялікай харальнай сінагогі праходзіць канцэрт, майстар-класы па вырабе яўрэйскай нацыянальнай стравы харасэт (сумесь арэхаў, садавіны, спецый і салодкага віна), настольныя гульні, ладзяць паэтычную гадзіну з Наталляй Літвінавай.

Яўрэйскія этнакультурныя традыцыі гістарычна аказваюць прыкметны ўплыў на складванне і развіццё нацыянальнай культуры краіны. Іх падтрымліваюць як у сінагогах, так і ў яўрэйскіх абшчынных цэнтрах і яўрэйскіх дабрачынных арганізацыях «Хэсэд». Айчыннае заканадаўства гарантуе, а дзяржава забяспечвае свабоднае развіццё яўрэйскіх традыцый у краіне.


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Общая численность населения, численность населения по возрасту и полу, состоянию в браке, уровню образования, национальностям, языку, источникам средств к существованию по Республике Беларусь: статистический бюллетень: https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/471/471b4693ab545e3c40d206338ff4ec9e.pdf.
2. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора имени Кондрата Крапивы (ИИЭФ).– Фонд. 6. Оп. 14. Д. 237.
3. Верашчагіна А. У., Гурко А. В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя.– Мінск, 1999.
4. Shoham H. The Bar and Bat Mitzvah in the Early Israel: From Initiation Rite to Bithday Party / H. Shoham // AJS Review. The Journal of the Association for Jewish Studies.– New York, 2018. V. 42. N1. P. 133–157.
5. Куцевич Е. Н. Гродненская еврейская община сегодня / Е. Н. Куцевич // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гродна, 10–11 крас. 2008 г.– Гродна, 2008. С. 512–517.